Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА

Беларусі

№ 20
КАСТРЫЧНІК
1934 г.

Выклік жанчынам—рэдактарам палітаддзельскіх газет

Я, быўшы работнік журнала „Работніца і калгасніца Беларусі", у звязку з дзесяцігоддзем журнала бяруся зрабіць наступнае:

1) Пашырыць рады селькорак у сваёй газеце і завербаваць не менш 30 новых селькорак у журнал.

2) У 5 буйных калгасах правесці з калгасніцамі гутаркі аб журнале, а таксама праз сетку сваіх селькораў прасунуць журнал у масы калгасніц.

3) План задання на падпіску па зоне дзейнасці МТС перавыканаць.

4) Прысвяціць спецыяльную старонку ў сваёй палітаддзельскай газеце дзесяцігоддзю журнала.

5) У сувязі з юбілеем выпусціць спецыяльную лістоўку да ўсіх калгасніц зоны дзейнасці МТС з заклікам прыняць актыўны ўдзел у журнале „Работніца і калгасніца Беларусі". Апрача гэтага абавязуюся да юбілея даслаць у журнал наступны матэрыял:

а) аб росце селькораўскага актыва па калгасах Слуцкай МТС.

б) Аб удзеле калгасніц у хлебазакупках.

в) Аб рабоце вылучэнак.

г) Аб выніках работы ясляў.

д) Канкрэтны паказ жывых людзей ударніц не менш 5 чалавек.

Выклікаю на соцспаборніцтва ўсіх жанчын—рэдактароў палітаддзельскіх газет БССР—Грынглаз (Лёзна), Ефрэменка (Буда-Кашалёў), Рабышэву (Глуск), Пістухову (Дрыса), Раскіну (Рэчыца), Бурдо (Жлобін), Волгіна (Крычаў).

ОЛЬГА БУЛКО

Рэдактар газеты палітаддзела Слуцкай МТС „За тэмпы і якасць".

Жаданне ўдарніцы

Цімашэнка Прося з красавіка 1934 года працуе брыгадзірам палявой брыгады калгаса „Чырвоны маяк", Кісцянёўскага сельсовета, Рагачоўскай МТС.

Скончыўшы двухмесячныя раённыя курсы калгасных брыгадзіраў, Прося прышла ў сваю брыгаду і па-большэвіцку ўзялася за работу. За гэты час яна змагла паставіць работу ў брыгадзе так, што яе брыгада па-ўдарнаму, без спазнення правяла ўборку, здачу хлеба дзяржаве і сяўбу азімых. У часе ўборкі брыгада Просі не дапушчала разрыву паміж уборкай і малацьбой. У выніку гэтага ўвесь хлеб абмалочан, 10 жніўня брыгада разлічылася з дзяржавай, а 13 жніўня быў зроблен разлік па натурплаце МТС.

Сяўбу азімых брыгада скончыла да 1|IX 34 года, здачу бульбы дзяржаве скончыла 16|IX-34 года.

У чым-жа сакрэт большэвіцкіх перамог брыгады Цімашэнка Просі? Сакрэт гэты ў тым, што Цімашэнка змагла правільна расставіць рабочую сілу ў брыгадзе. Яе брыгада разбіта на звенні. Паміж звеннямі разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Сама Цімашэнка заўсёды ў брыгадзе кіруе соцспаборніцтвам, штодзённа вымярае выпрацоўку кожнага звяна. Вы часта можаце пачуць ад калгасніц:

— Просіна звяно наперадзе ўсіх, ударнае звяно!

Сваёй стараннасцю, ударнай работай Цімашэнка Прося змагла заваяваць аўтарытэт усіх калгаснікаў. Зараз Цімашэнка выказвае жаданне вучыцца, каб быць карыснай не толькі ў сваёй брыгадзе, але і на больш адказнай рабоце. Трэба дапамагчы Цімашэнка Просі здзейсніць яе жаданне.

Шалаева.

Цімашэнка Прося.

Першая калгасна-соўгасная спартакіяда

12 кастрычніка на стадыёне „Дынамо" адбылася першая раённая соўгасна-калгасная фізкультурная спартакіяда. Прыймалі ўдзел у ёй 12 каманд соўгасаў і калгасаў Менскага раёна. На стадыёне адбыліся спаборніцтвы па забегам мужчын і жанчын на 100 метраў.

У мужчынскім забегу першае месца заняў Салаўёў (соўгас Горкі Абчак)—13,9 секунд, другое мейсца—Ткачоў (Горкі)—14,1 сек., 3 мейсца — Шаран (калгас „Новы быт")—14,2 сек.

Андрэеўская –удзельніца спартакіяды.

У жаночым забегу першае мейсца заняла Казлоўская (соўгас „Рунінавічы") — 16,8 сек., другое мейсца — Бохан (соўгас „Вішнеўка")—17,1 сек., трэцяе мейсца — Лагеўская (калгас „Чырвоны спецыяліст")—17,4 сек.

Пасля адбылася жаночая і мужчынская шведская эстафета. Жаночая эстафета на 100 і мужчынская на 250 метраў. 13 кастрычніка адбудуцца спаборніцтва па бегу на 500 і 1000 метраў, па мятанню ядра і іншых відаў лёгкай атлетыкі.

ВЫШЭЙ СЦЯГ ВКП(б)—АРГАНІЗАТАРА ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ!

XVII год

Ін. Ар. Бел. Ср. Ар.

Прайшло XVII год пролетарскай дыктатуры. Скінуўшы ўладу буржуазіі і памешчыкаў, рабочы клас, калгаснае сялянства і ўсе працоўныя Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна дасягнулі велізарнейшых поспехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

У выніку барацьбы за пабудову соцыялістычнага грамадства, рабочы клас за 17 год дабіўся гістарычных перамог і поспехаў, якія зусім змянілі твар старой, памешчыцка-капіталістычнай Расіі, якая з краіны адсталай ператварылася ў краіну перадавую ў тэхніка-эканамічных адносінах, у краіну індустрыяльную і магутную, у краіну буйнейшай у свеце сельскай гаспадаркі.

Калі зараз капіталістычны свет б'ецца у безвыхадным становішчы крызіса і беспрацоў'я, калі закрываюцца цэлыя канцэрны, фабрыкі і заводы, то ў СССР мы маем небывалы ўздым соцыялістычнага будаўніцтва, небывалы рост сельскай гаспадаркі і прамысловасці.

У нас створаны новыя галіны вытворчасці: станкабудаўніцтва, аўтамабільная прамысловасць, трактарная прамысловасць, хімічная прамысловасць, металабудаўніцтва, самалётабудаўніцтва, камбайнабудаўніцтва, вытворчасць магутных турбін і генератараў, якасных сталей, ферасплаваў, сінтэтычнага каучуку, азота, штучнага валакна і т. д.

Калі ў даваенны час агульная вага прамысловасці былой царскай Расіі складала 42,1 проц., то ўжо ў 1933 годзе яна складае 70,4 проц. Валавая прадукцыя БССР у даваенны час складала 17 проц., а ў 1933 годзе ўжо 60 проц. За апошнія тры з паловай гады толькі па БССР уступіла ў строй 17 буйнейшых прадпрыемстваў.

Адсталая сельская гаспадарка ў мінулым, з яе прымітыўнымі прыладамі апрацоўкі, рашуча пераведзена на соцыялістычны шлях. Ужо ў 1933 годзе было калектывізавана па Совецкаму Саюзу 65 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Па БССР у 1933 годзе было калектывізавана 43,7 проц., а зараз ужо маецца каля 62 проц., пры чым ёсць раёны, якія ахоплены калектывізацыяй на 70—80 і больш проц.

Сотні тысяч трактароў і складаных сельгасмашын, дзесяткі тысяч аўтамабіляў і камбайнаў паслала наша соцыялістычная прамысловасць на калгасныя і соўгасныя палі, выконваючы лозунг тав. Сталіна: „пасадзіць СССР на аўтамабіль, а мужыка на трактар".

У БССР маецца 72 МТС з агульнай колькасцю трактароў 2.120, не ўлічваючы сюды 1381 тракатар, якія знаходзяцца ў карыстанні асобных калгасаў і соўгасаў.

На фоне велізарнейшых поспехаў у соцыялістычнай рэканструкцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, наша краіна дабілася небывалых поспехаў і на фронце культурнага будаўніцтва. Палепшыўся дабрабыт рабочых і калгаснікаў. Поўнасцю ліквідавана няпісьменнасць. Створана вялікая сетка беларускіх, яўрэйскіх, польскіх і іншых школ.

Дасягнуты велізарнейшыя поспехі ў справе навукі, літаратуры і мастацтва. Гэта пацвярджаецца тым, што БССР мае сваю акадэмію навук, 31 навукова-даследчы інстытут, 18 вопытна-навучальных устаноў, кансерваторыю, 81 тэхнікум, 76 дзесяцігодак, 1805 няпоўных сярэдніх школ, звыш 5240 навучальных школ.

Калі ў 1931 годзе ў БССР было 6813 школ і ў іх 7668 тысяч вучняў, то ў 1934 годзе налічваецца 7123 школы і ў іх 857735 вучняў, а ў новым навучальным 1934-1935 годзе ў школах навучаецца 1000013 чалавек. Ахоп дзяцей дашкольнымі ўстановамі вырас з 55170 чалавек да 163185 чалавек. У гэтым годзе працуе 6711 дзіцячых яслёў і 131 кансультацыя.

Таксама маецца значны рост устаноў па ахове здароўя працоўных. Калі ў 1933 годзе было 173 бальніцы на 6349 ложкаў, то ў 1934 годзе налічваецца 182 бальніцы на 9397 ложкаў. Сетка медычных кансультацый павялічылася з 413 да 569.

Усе гэтыя перамогі суправаджаліся жорсткай класавай барацьбой, пры ўпартым супраціўленні капіталістычных элементаў. КП(б)Б вяла жорсткую барацьбу з усялякімі скрыўленнямі лініі нашай партыі, з усялякімі праявамі контррэволюцыйнага нацыянал-дэмакратызма і вялікадзяржаўнага шавінізма, ажыццяўляючы словы правадыра сусветнага пролетарыята тав. Сталіна: „сільная і магутная дыктатура пролетарыята, вось што нам патрэбна зараз, каб развеяць у прах апошнія рэшткі паміраючых класаў і разбіць іх зладзейскія махінацыі".

XVII з'езд ВКП(б) паставіў перад намі задачу далейшага ўмацавання советаў, як масавых органаў дыктатуры пролетарыята, шляхам перабудовы і ажыўлення іх оргамасавай работы.

Зараз мы напярэдадні перавыбараў советаў.

Выбары ў советы—масавая палітычная кампанія, найшырэйшы агляд дасягненняў і перамог соцыялістычнага будаўніцтва. Выбары—магутны сродак арганізацыі мільёнаў мас рабочых, калгаснікаў і совецкай інтэлігенцыі на далейшую пабудову соцыялізма і ўмацавання советаў—органаў пролетарскай дыктатуры.

Патрэбна выбраць у советы лепшых людзей з ліку лепшых ударнікаў вытворчасці і калгасаў, герояў пяцігодкі, якія на справе, а не на словах паказалі адданасць комуністычнай партыі і совецкай уладзе, людзей, якія не пустой балбатнёй, а практычнымі справамі могуць забяспечыць ажыццяўленне генеральнай лініі партыі. Такая задача зараз усіх арганізацый, усіх выбаршчыкаў.

Справа гонара ўсіх рабочых і работніц, калгаснікаў і калгасніц правесці XVII гадавіну Окцябра датэрміновым выкананнем прамфінплана, дасягнуўшы высокіх якасных паказчыкаў, паспяховым завяршэннем усіх сельскагаспадарчых работ, далейшым згуртаваннем радоў вакол вялікай і слаўнай партыі Леніна—Сталіна на выкананне чарговых задач другой пяцігодкі.

ГПБСр. Аб. 1

Семнаццаты Окцябр

Зоя Ферко

Семнацаты год, семнаццатую восень
Будуем край мы свой аквечаны зарой!
Імпэтна, непахісна йдзем наперад
Хадою пераможнай змагароў.

Растуць заводы, фабрыкі і домны,
Калгасаў незлічоных крочыць рацъ.
І ва ўчарашнім краі хмызняковым
Сягоння Беларусь Советаў не пазнаць.

Яна расце—краіна сонечнага гарту,
Будуем мы яе работніцы станка, палёў,
Мы дружным поступам ідзем ў хадзе упартай
Пад ясны бляск запаленых агнёў.

За намі цвёрда, з радасцю кіпучай
Замежныя браты і сёстры ўслед,
Ўсе выйдуць прывітаць краіну гучнай
Спяванкай радасці у дні пабед!

Маці

Ал. Шарапаў

„Смерть не сметь".—В. Маяковский.

Вакзал хваляваўся...
Плацформамі вузкімі.
Утомаю горды дыхнуў паравоз—
Ці жарты—
Герояў пахода „Чэлюскіна"
Ў сталіцу радзімы
Ён сёння прывёз.

Беглі—
У кветках, у выгуках звонкіх—
З роднымі
Беглі сустрэцца,
З сябрамі.
Яна—у баку,
Ля чыгуннай калонкі.
Вочы застыглі
Няласкавым раннем.
Хацелася верыць,
Што раптам з вагона
Шчаслівы і радасны выбяжыць ён,
І радасць другіх узлятала з перона,
І белым пралётам прасвечваў вагон.

Вакзал хваляваўся
Ў мяцеліцы гучнай—
Смяяўся і плакаў,
Спяваў і крычаў.

Вунь злева,
Напэўна сябры неразлучныя
Адзін аднаго
Б'юць не раз па плячах.

Пілот
Па партрэтах знаёмы краіне
На рукі падняў маладую жану—
Цалуе, смяецца...
А побач
Аб сыне.
Пытаецца маці, як ён патануў.
— Вы маці Барыса?!
Таварыша значыць?!
...Замкнулі яе ў жывое кальцо.
Стаіць яна ціхая,
Плача і плача,
Ўціраючы вочы
Хусцінкі канцом.
Старую абвеялі
Ласкавым гоманам.

Быць мяккім і ласкавым
Кожны гатоў...
І вось падыходзіць
Так добра знаёмы,
Праслаўлены лётчык
Маўрыкій Сляпнёў:
— Замкнулі магілу
Арктычныя хвалі,
Ды памяць аб ім
Не зацёрлі ільды.
Імя яго нам
Ўсе паўстанкі крычалі,
Спявалі пра мужнасць яго
гарады!
Такім
Як ваш сын
У вяках не памерці.
Імя яго—славу
Не змые вадой.
Ён ўстане
Над крыгамі,
Ўстане над смерцю
І ордэн успыхне
Палярнай звяздой.
— Ён ўстане!—
Уторыў, здавалася камень,
— Устане!
Як песня гуло над Масквой.
Карына народжаная ільдамі,
Як дзень усміхалася
Матцы старой.
І ўздрыгнула сэрца,
Працятае горам,
І вочы бліснулі
Як неба якраз:
— Радзімыя!
Бачу любімага Бору,
Любімага сына ў кожным з вас.
Хіснулася ў маршы
Людская лавіна
І ў шэрагу першым,
Скуль песня расла,—
Яна—
нечакана згубіўшая сына,
Яна—пролетарская маці—ішла!

Пераклаў з рускае М. Б.

Работніцы-швейніцы БССР! Змагайцеся за пяршынства ў спаборніцтве з УССР!

17 гадавіну Окцябра адзначым выпускам высокай якасці прадукцыі, поўным аўладаннем тэхнікі!

Тав. Абезгауз—ударніца-зотаўка, групорг КСМ пальтовага цэха фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі".

ЗА ЛЕПШУЮ МАРКУ ў СВЕЦЕ

Г. Мельнікава—лепшая зотаўка пальтовага цэха ф-кі „Сцяг індустрыялізацыі", вылучана на курсы інструктараў.

Не так даўно Віцебская швейная фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі" знаходзілася ў глыбокім прарыве, не гледзячы на тое, што фабрыка мела добрае абсталяванне, а таксама ўсе ўмовы для выканання свайго прамфінплана.

Чым тлумачыўся такі глыбокі прарыў? Тлумачыўся ён тым, што фабрычныя арганізацыі не здолелі правільна арганізаваць вытворчую і партмасавую работу, тым больш, што на фабрыцы была выключная большасць маладых рабочых з вёскі, якія ніколі не працавалі на вытворчасці і не ведалі вытворчай дысцыпліны. Акрамя таго, фабрыка была яшчэ засмечана класава-варожымі элементамі. Безумоўна, што пры такіх умовах патрэбна была класавая пільнасць і моцная палітвыхаваўчая работа. Аднак гэтага на фабрыцы не было. Кіраўнікі не ведалі складу рабочых.

ЦК нашай партыі не мог далей цярпець той бяздзейнасці, якая мела месца на новай соцыялістычнай фабрыцы „Сцяг індустрыялізацыі". Неадкладна былі мабілізаваны больш здольныя члены партыі, як тав. Калабкоў (дырэктар фабрыкі), Рохкін (сакратар парткома) і іншыя таварышы, якія з першага дня сваёй работы ўзяліся за перабудову структуры гаспадарчай, партмасавай і прафсаюзнай работы.

Калі раней была лентачная сістэма на сто і больш чалавек, то зараз арганізаваны брыгады па 25—30 чалавек, якія маюць сваіх брыгадзіраў, прафарганізатараў, рэдкалегіі штодзёнак і іншыя грамадскія арганізацыі. Такая сістэма дала магчымасць больш наблізіцца да рабочых мас і распазнаць кожнага рабочага паасобку.

На фабрыцы раней праводзілася індывідуальнае соцспаборніцтва і соцспаборніцтва паміж цэхаў, што не давала належных вынікаў, бо было заключана 4 тысячы індывідуальных соцумоў, якіх ніхто не правяраў.

У падрыхтоўцы да XVII партз'езда фабрычныя арганізацыі ўводзяць новыя метады соцспаборніцтва—абвяшчаюць конкурс на сталінскую брыгаду, для чаго прад'яўляюць некалькі умоў: перавыконваць прамфінплан, не перавышаць брак і пераробкі, дапушчаемыя па плану, аўладаць тэхнікай вытворчасці, ачысціць брыгады ад класава-варожых людзей і іншае.

З першага дня ўключэння ў конкурс быў наладжан дасканалы штодзённы кантроль на спецыяльных лістках, дзе адзначалі выкананне абавязкаў па кожнай брыгадзе паасобку. Кожную пяцідзёнку кантрольны ліст здавалі ў фабком, дзе падводзіліся вынікі соцспаборніцтва кожнай брыгады. Умовы конкурса ўтвараліся толькі на адзін месяц. Кожны наступны месяц рабіліся змены, альбо ўносіліся дадаткі згодна тым палітычным і гаспадарчым задачам, якія стаялі перад фабрыкай.

Адначасова дырэкцыя і фабком узялі на сябе абавязацельствы: забяспечыць сталінскія брыгады ўдарнымі абедамі, грашовай дапамогай і ўдарным пайком, а таксама ў першую чаргу забяспечыць культурным абслугоўваннем.

У выніку гэтай работы мы маем велізарныя поспехі фабрыкі, якая ліквідавала ганебны прарыў,



Агульны выгляд ф-кі „Сцяг індустрыялізацыі" (Віцебск).

палепшыла якасць, вырасціла велізарнейшы прафсаюзны і рабкораўскі актыў, якога фабрыка не ведала раней,

Старшыня фабкома тав. Канэр заяўляе:

— Самае галоўнае, што ў рабоце вырашае поспех—гэта брыгада і прафорг. Вялікая заслуга фабрычных арганізацый у тым, што яны перанеслі ўвесь цэнтр увагі сваёй работы непасрэдна ў брыгаду, у профгрупу.

Калі ўзяць для прыклада прафорга тав. Свістунову, то ў яе брыгадзе мы маем 75 проц. рабочых зотаўцаў-значкістаў. У прафорга Эпштэйна 2-га ўчастка бручнага цэха, з агульнай колькасці рабочых 25 чалавек—13 зотаўцаў. Гэтыя брыгады кожны дзень выпускаюць свае газеты. У прафорга тав. Шкатулавай—у брыгадзе 25 чалавек, з іх 16 зотаўцаў. Апрача гэтага ўсе зотаўцы з'яўляюцца лепшымі ўдарнікамі.

Мы можам знайсці яшчэ рад прафоргаў, як Кміт з закройнага цэха, Ендрыкоўская—кашомны цэх, Хнэль і іншыя. Гэтыя таварышы не толькі выконваюць план і выпускаюць палепшаную якасць прадукцыі, яны вырашаюць увесь поспех фабрыкі. А такіх людзей можна шмат знайсці ў пяцітысячным калектыве. Гэта новы энергічны кадр барацьбітоў соцыялістычнага будаўніцтва. Фабрыка імі ганарыцца.

Яшчэ больш узмацнілася барацьба за якасць прадукцыі пасля таго, як швейная прамысловасць БССР пачала спаборнічаць з Украінай.

На фабрыцы арганізаваны брыгадныя і агульна-фабрычныя журыйныя камісіі, якія штодзённа правяраюць якасць выпускаемай прадукцыі.

Агульна-фабрычная журыйная камісія арганізавала штодзённы выпуск бюлетэня аб становішчы якасці, а таксама фабрычную выстаўку, дзе на кожным пальто, касцюме паказваецца недахоп кожнай аперацыі і рабочага паасобку, што дае магчымасць на хаду выпраўляць дапушчаныя памылкі. Кожны прафорг, брыгадзір, штодзёнка і рабочы ўпарта змагаюцца за тое, каб іх фабрычная марка была лепшай у свеце.

У спаборніцтве з Украінай фабрыка мае зараз 13 сталінскіх брыгад, якія з гонарам апраўдваюць сябе сваёй работай і арганізаванасцю.

Не дрэннае становішча на фабрыцы і ў сэнсе забеспячэння матэрыяльна-бытавых умоў рабочых. Фабрыка мае ўзорныя дзіцячыя яслі і сад, што дае магчымасць работніцы спакойна працаваць і вучыцца. Пры фабрыцы таксама арганізован прафілакторый, дзе рабочы-ўдарнік без адрыва ад вытворчасці можа папраўіць сваё здароўе.

Усё гэта дасягнута фабрыкай дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву, дзякуючы ўмелай перабудове гаспадарчых і профсаюзных арганізацый у іх барацьбе за авалоданне тэхнікай, за соцыялістычныя метады працы, за лепшую марку ў свеце.

Левіцкая.

Менск.

З НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ СУСТРАКАЕМ XVII ГАДАВІНУ

Пры абвяшчэнні соцспаборніцтва швейнай прамысловасці БССР з Украінай на лепшую фабрычную марку, наша швейная фабрыка „Окцябр" (Менск) заключыла соцумову з швейнай фабрыкай імя Цінякова (Харкаў).

Асноўнай задачай соцспаборніцтва было—пашырыць фасонасць і палепшыць якасць прадукцыі.

Пасля заключэння соцумовы мы разгарнулі масавую работу па цэхам і фасонам. За час спаборніцтва мы дабіліся значных поспехаў—шыем зараз 15 фасонаў пальто, з якіх 4 фасоны дзіцячых. Апрача гэтага мы арганізавалі вітрыну брака і добраякаснай прадукцыі.

У парадку агульнага конкурса мы абвясцілі ўнутры фабрычны конкурс на сталінскую брыгаду і на лепшы фасон. Зараз кожная брыгада змагаецца за атрыманне назвы імя тав. Сталіна. Лепшыя ўдарнікі ўзялі самаабавязацельствы — палепшыць якасць прадукцыі, перавыканаць план, узмацніць наведванне тэхвучобы і т. д. Для праверкі і кіраўніцтва конкурсам вылучана агульна-фабрычная журыйная камісія, а таксама ў кожнай брыгадзе—тройкі, якія правяраюць выкананне самаабавязацельстваў.

Брыгадныя штодзёнкі сістэматычна асвятляюць на сваіх старонках ход спаборніцтва. Дзякуючы разгорнутай масавай рабоце мы змаглі ахапіць тэхвучобай 210 рабочых, па тэхмінімуму—600 рабочых і на курсах ПТК займаецца ўвесь ІТР.

План выканалі за 9 месяцаў 1934 года на 100,8 проц. і за III квартал на 100 проц., не глядзячы на тое, што мы мелі прастой з-за адсутнасці сыравіны, асабліва ў верасні.

Першае месца ў спаборніцтве займае 43 фасон, які выканаў план на 113,9 проц. і ўзяў пераходны сцяг фабрыкі. Гэты фасон не ведае ні аднаго акта за дрэнную якасць. Такіх дасягненняў 43 фасон дабіўся дзякуючы актыўнай рабоце лепшых ударнікаў: Рома, Кітайчыка, Ліўшыц і іншых. Па добрай і сумленнай рабоце 43 фасона зараз праўняюцца і ўсе астатнія фасоны фабрыкі.

У сучасны момант наглядаецца вытворчы энтузіязм па ўсіх фасонах. Гэта з'яўляецца зарукай таго, што XVII гадавіну Окцябра фабрыка „Окцябр" сустрэне з яшчэ большымі дасягненнямі па ўсіх агрэгатах.

Ф. Падольская.

Менск.

Змагацца за высокую якасць прадукцыі, вытравіць канцэлярска-бюракратычныя метады работы, па-большэвіцку аўладаць тэхнікай—цэнтральная задача арганізатараў соцыялістычнай гаспадаркі, справа ўсяго рабочага класа.

Усебеларускі з'езд рабселькораў сустрэнем з новым ростам зотавак-рабкорак

Пасля апублікавання пастановы ЦК КП(б)Б аб скліканні ўсебеларускага з'езда рабселькораў Менская шчотачная фабрыка імя Крупскай разгарнула масавую падрыхтоўчую работу. На фабрыцы праведзены рабкораўскія рэйды па ўшчыльненню рабочага дня, падрытоўкі да зімы і т. д. Па ініцыятыве рэдакцыі шматтыражкі арганізавана брыгада імя 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў, якая выканала прамфінплан III квартала на 105 проц.

Дзякуючы разгорнутай масавай работы на фабрыцы значна вырасла колькасць рабкораў і цэхавых газет. Напрыклад, раней выпускалі 6 цэхавых газет, а зараз—14, якія штодзённа асвятляюць ход выканання прамфінплана, соцспаборніцтва паміж брыгадамі, тэхвучобу і. т. д.

Лепш за ўсё пастаўлена работа штодзёнак рэдактароў т.т. Левінай (ткацкі цэх), Гутман—(буравачны цэх). Іх газеты жывыя, канкрэтныя і аператыўныя.

У цэху тав. Левінай маюцца 22 зотаўкі, якія актыўна ўдзельнічаюць у рабоце штодзёнкі. Тэхучобай ахоплена 250 чалавек, з іх 44 зотаўкі.

Зотаўкі—рабкоркі ткацкага цэха т.т. Фельдман, Уладзімірава, Барташэвіч і Марголіна ўзялі на сябе абавязацельствы: да 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў падрыхтаваць новых зотавак-рабкорак. Гэтыя абавязацельствы яны з гонарам выканаюць.

Зараз падрыхтоўку да ўсебеларускага з'езда рабселькораў рабкоркі цесна ўвязалі з падрыхтоўкай да перавыбараў советаў.

Б. Л.

Лепшы брыгадзір тав. Сердзюкова

Тав. Сердзюкова Лена—маленькі дырэктар вытворчасці, дзе працуе 28 чалавек і 14 экаціровачных машын. Яе брыгада заваявала імя тав. Сталіна.

З 28 членаў брыгады,—18 выдатнікаў і 4 здалі тэхэкзамен на „добра". Брыгада Сердзюковай не ведае браку, таму што кожная работніца—на выдатна асвоіла сваю машыну і кожны шрубік паасобку. Калі ўзяць выдатніцу Кацуру Еву—машыністку машыны № 7 і яе памочніцу Малафееву Анну, то яны свой план замест 36 яшчыкаў, выконваюць па 42—43. Тое ж самае робяць Саланец Маия і яе памочніца Комар Рахіль. Яны даюць высокую якасць і штодзённа перавыконваюць план. Такіх работніц у брыгадзе не мала. Возмем такіх, як: Гарбачэнка Наталя, Баранава, Катлер, Гетчанкова Каця, Сівуха Соня і іншыя. Яны сваёй добрасумленнай работай, беражлівымі аднасінамі да дзяржаўнай маёмасці дабіліся значных поспехаў у рабоце.

Поспехі гэтай брыгады заключаюцца ў тым, што яна канкрэтна рэалізавала лозунг: „кожны рабкор—ударнік, кожны ўдарнік—рабкор". Ударніцы прымаюць актыўны ўдзел у рабоце насценгазеты. Яны сваім вострым пяром і асабістым прыкладам вучаць людзей, як трэба працаваць. Насценгазета штодзённа мабілізуе і арганізоўвае брыгаду на выкананне і перавыкананне плана. Калі работніца на машыне № 11 Усхопава не выконвала план, газета зараз-жа аб гэтым загаварыла. Брыгадзір тав. Сердзюкова ўзяла над ёю шэфства і Усхопава пачала падцягвацца. Зараз газета ставіць сваёй мэтай уцягнуць Усхопаву ў тэхвучобу і дабіцца таго, каб яна зрабілася выдатніцай.

Ударніцы ў гонар падрыхтоўкі да 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў праз газету „Чырвоны окцябр" узялі на сябе рад абавязацельстваў. Гэтыя абавязацельствы не застаюцца пустымі фразамі, яны па-баявому праводзяцца ў жыццё.

За час падрыхтоўкі да з'езда, брыгада абрасла вялікім рабкораўскім актывам і штодзённа змагаецца за дзейнасць рабкораўскіх допісаў.

Зараз брыгада змагаецца за заваяванне права на рапарт VII з'езду Советаў.

М. Белкін.

Рэчыца, Запалкавая ф-ка „X Окцябр"

Маці-работніца спакойна працуе ў цэху

Запытайце любую маці—работніцу Віцебскай швейнай фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі" аб фабрычных дзіцячых яслях і яна вам адразу адкажа:

— Я працую ў цэху зусім спакойна, таму што маё дзіця знаходзіцца ў добрых яслях.

І сапраўды, калі пазнаёміцца з яслямі фабрыкі, то мы ўбачым выключную работу ясляў.

Дзеці трымаюцца ва ўзорнай чыстаце, харчаванне добрае, дзеці атрымліваюць у яслях разумныя культурныя звычкі і добра развіваюцца.

Трэба асабліва адзначыць вялікую работу ясляў у 1934 годзе. Па ініцыятыве загадчыцы ясляў тав. Брук, а таксама галоўнага доктара Масковай былі знойдзены сродкі і ўзорна праведзена аздаравіцельная кампанія.

На працягу ўсяго лета дзеці знаходзіліся на дачы. Дзеці фізічна акрэплі і падраслі. 14 верасня яслі перадалі 30 дзяцей у дзіцячы сад. Вельмі пажадана, каб і сад выхоўваў нашых дзяцей не горш чым яслі.

Работніца ф-кі „Сцяг індустрыялізацыі"—Цыпкіна.

Андрэй Александровіч

Беларуская казка

За марамі, там дзе горы,
За гарамі, дзе вазёры,
За вазёрамі, пад сонцам,
У закінутай старонцы
Ёсць гара.
На тэй гары,
У дубовым гушчары
Жыў спакойна ўвесь свой век
Невядомы чалавек.
Жыў багатым жываглотам,
Працаваць не меў ахвоты.
Ад зары і да зары
Знемагалі за работай,
Пад крывавым, чорным потам
Толькі птушкі і звяры.
Сам не сеяў, не араў,
Ледзь нагой пераступаў,
А ўсяго яму ставала—
Хлеба, солі, круп і сала.
Свінні дзікія аралі,
Галкі ўслед баранавалі,
Бусел сеяў. Нават козы
Дзёрлі лыка з вербалозаў,
А мядзведзь каля кустоў
З тога лыка лапці плёў.
Як засцеле завіруха
Шлях дарогу белым пухам
Ці на захад, ці на ўсход
Сабіраўся у паход
Звярадавец—гаспадар
Прадаваць дабро—тавар.
Двор гудзеў перапалохам,
Усцілалі санкі мохам,
Кожны лётаў,
ахаў,
охаў—
Суматоха, суматоха!..
Загудзеў мядзведзь у рог,
Што ласёў ужо запрог.
Гусі—лебедзі вароты
Адчыняюць жываглоту.
Дзятлы б'юць у барабан:
— Едзе,
едзе,
едзе—
Пан!
Вераб'і іграюць марш:
—Едзе,
едзе
на кірмаш!..
Пан сядзіць і ў вус не дуе,
Едзе ноч—адну, другую.
Без канца, без перастанку,
Колькі сілы, цягнуць санкі
Цераз пушчы, цераз горы,
Праз даліны, праз вазёры,
Без дарог і без шляхоў
Адзінаццаць пар ласёў.
А з бакоў бягуць ваўкі,
Як стральцы—вартаўнікі.
Караван стралой імчыцца.
Хмарай снежны пыл віхрыцца.
Пану —
мала, мала, мала...
Гоніць ход страшэнны ход!
Зло ў ласёў забушавала,
Гневам кроў забунтавала:
—Эх, трымайся, жываглот!
Як рванулі, тузанулі—
Пан кручком перакуліўся,
І, як бочка, пакаціўся
З горкі—
уніз,
уніз,
уніз...
Пана снегам заваліла.
Курганом расла магіла.
—Будзе помніць, будзе знаць,
Як чужую кроў смактаць!
А ласі з ваўкамі ходу—
У лес!
На волю!
На свабоду!

Е. Сямёнава

Марына Баброва

(Урывак з апавядання)

Цішыня і ласкавая цеплыня ад праса ізноў навеялі на Баброву ўспаміны. Цяпер ёй успамінаўся 1920 год. Вось стаіць яна дванаццацігадовая дзяўчынка каля вялікага, пакрытага чырвоным абрусам стала

— У каго ёсць запытанне да Марынкі?—пытаецца дваццаці двухгадовая, чарнабровая красуня Рыта—старшыня комсамольскага схода.—А чаго пытаць?—адказвае незграбны, але ўсімі любімы Ваня Чарноў,—ведаем мы Марынку! Батрачка яна, з самай што ні на ёсць беднай сям'і. Прыняць яе і ўсё тут!

— Хто за тое, каб прыняць Марынку Баброву ў члены саюза моладзі?

Пры гэтых словах хутка, хутка застукала Марынкіна сэрца.

— Прынята аднагалосна!—Рыта не паспела дагаварыць, як да стала падбег Міша Вараб'ёў, нядаўна пераведзены з комсамола ў партыю:

— Таварышы, спакойна! Пачалося паўстанне... Паўстанцы ў 10 вярстах. Сяло на асадным палажэнні... Па загаду рэўкома ўсе комуністы і комсамольцы зараж-жа павінны з'явіцца ў клуб комуністаў і атрымаць вінтоўкі. Рыту і Марынку рэўком упаўнаважыў эвакуіраваць гарадскую больніцу, хворых комуністаў і комсамольцаў, а таксама і беспартыйных актывістаў.

У зале пачалася мітусня. Людзі выходзілі на вуліцу, хутка строіліся ў калоны і са спевамі ішлі наперад. Бадзёрыя, гордыя тым, што зараз іх узброяць і пашлюць на абарону совецкай улады. Што будзе заўтра? Можа шмат хто загіне? Але гэта зараз нікога не страшыць. Смела і ўпэўнена рушыцца калона наперад.

У клубе ўсіх дзяўчат і хлапцоў узброілі і паслалі на справу—каго ў разведку на тэрыторыю супраціўніка, каго на сувязь з суседнімі сёламі, яшчэ неахопленымі паўстаннем, а каго вартаваць цэласць тэлеграфных правадоў.

Якая шчаслівая Марынка! Жартачкі? Яна—Марынка самая бедная і самая забітая на вёсцы дзяўчына, бачыўшая столькі крыўды і насмешак, цяпер аднагалосна прынята ў комсамол, удзельнічае ў такой важнай справе, як ліквідацыя Чапанаўскага кулацкага паўстання. Ёй даверыў рэўком вінтоўку, даручыў эвакуіраваць у горад хворых таварышоў.

Шмат працы было Марыне ў гэтую ноч. У сяле панаваў тыфус. Больш паловы членаў комуністычнай і комсамольскай ячэек было хворымі. Хварэла таксама шмат беспартыйных, але адданых, актыўных совецкіх працаўнікоў. Да гэтага было вядома, што як комуністаў, так і беспартыйных совецкіх працаўнікоў паўстанцы забівалі ды яшчэ жорстка здзекваліся перад смерцю. Трэба было неадкладна сабраць па сяле ўсе кажухі, шубы, валенкі для хворых. Маразы стаялі суровыя. Цяжка было давезці ў горад за 25 вёрст хворых, з высокай тэмпературай, трызніўшых і імкнуўшыхся кудысці бегчы.

Але з гонарам выканалі комсамолкі гэта даручэнне. Хворыя былі дастаўлены ў горад, а кулацкае паўстанне ліквідавана.

Потым наступіла для Марынкі такое поўнае, кіпучае і цікавае жыццё. Дзень за днём ёй пачалі даваць работу ўсё больш сур'ёзную і адказную. А праз некаторы час старшыня рэўкома прапанаваў на партыйным сходзе:

—Марыну Баброву за беззаветную адданасць і гераічную абарону Совецкай улады—прыняць у партыю без кандыдацкага стажа.

* * *

Усё больш і больш захапляўся Марына сваёй работай. Бязследна зніклі панурасць і замкнутасць. Вясёлым зрабіўся твар яе. Ва ўсякай адказнай рабоце пачала смела ўдзельнічаць Марына. У аблаву, ці на дэзерціраў ехаць, ці дапамагчы прадатраду ў яго рабоце, ці арганізаваць суботнік па распілоўцы дроў—усюды Марына ў ліку, першых.

Тры разы хварэла тыфусам, а ўсётакі не здалася. Памёрла ад тыфуса 15-гадовая сястра яе, невытрымала голаду—маці. Усё гэта не зламала комсамолкі Марыны Бабровай.

Часта, да самага досвітка, пры святле лучыны праседжвала яна за кнігай. Потым трапіла Марына ў горад. Паступіла на суконную фабрыку. На фабрыцы Марына падружылася з комуністам Іосіфам Дзітманам—палонным імперыялістычнай вайны.

А вось сёння ўвечары і для фабрыкі, і для Марыны Бабровай, і для яе мужа Іосіфа Дзітмана—вялікае свята.

Сёння ўвечары фабрыка будзе святкаваць свой пераход у новае памяшканне. Будзе святкаваць сваё ператварэнне з бруднай, на палову саматужнай майстэрні, у буйную, чыстую фабрыку, абсталяваную па апошняму слову тэхнікі совецкімі машынамі.

Сёння калектыў фабрыкі будзе ўшаноўваць слесара Іосіфа Дзітмана—рацыяналізатара і вынаходцу, які даў сваёй фабрыцы не адзін мільён рублёў эканоміі. Разам з гэтым фабрыка будзе адзначаць і сваю лепшую работніцу Марыну Баброву.

Седзячы за сталом, у думках перад Марынай праплывала яе безрадаснае мінулае і светлае, шчаслівае жыццё сённешніх дзён. Вось зараз перад ёю на ложку радасна ляпеча яе сын, якога чакае светлае жыццё і радасная будучыня.

Гледзячы на сына і светлыя промені, якія ігралі па падлозе, Марына ўспомніла пра сваю маці:

— Бедная матуля! Калі-б ты магла ўстаць, хто-б мог апісаць тваю радасць, калі-б ты ўбачыла, якое жыццё наступіла для тваёй дачкі і тысяч падобных да яе работніц і сялянак.

Окцябрская рэволюцыя вызваліла работніцу і сялянку.
У краіне советаў жанчына стала поўнапраўным будаўніком соцыялізма.
Працоўныя жанчыны—уперад да новых перамог!

ВЫШЭЙ СЦЯГ СОЦЫЯЛІСТ

Усціння Сталярова

Калгас спаткаў нас з вялікай радасцю. Калгаснікі абступіўшы нас з захапленнем пачалі апавядаць пра сваё багатае заможнае жыццё і перамогі.

— Працуем, браточкі, што называецца. Ільнопрадукцыю дзяржаве здалі першымі ў раёне, і па колькасці і па якасці. З бульбай і хлебам таксама разлічыліся. Зараз вось пераключыліся на жывёлагадоўлю. Рыхтуем жывёле цёплую і сытую зімоўку. Мы ёй таксама хочам забяспечыць заможнае жыццё,— расказвае старшыня калгасу Быхавец Міхась.

— Мая жывёла ўжо забяспечана—упэўнена дадае лепшая свінарка-ударніца Сталярова Усціння,—свінні мае сыты і дагледжаны і маюць цёплае памяшканне.

— Правільна, Усціння. Гэта работа! Жартачкі—110 матак і 400 штук прыплоду, трэба добрае вока мець.

— А як-жа іначай?!—пацвярджае Усціння, нібы падшукваючы словы.

—І нельга іначай,—дадае старшыня, звяртаючыся да нас,—наш калгас у гэтым годзе высунуўся на адно з першых месц у раёне. Будзеце аглядаць нашы фермы—убачыце самі.

І сапраўды, пастаноўка работы на фермах калгаса заслугоўвае ўвагі. Не хочацца верыць, што гэта двор для свіней. Роўны насціл вялікага двара старанна ўсыпан, жоўтым пяском. Чыстата і ўтульнасць. На ўсім адчуваецца клапатлівасць і добрае гаспадарчае вока.



Тав. Сталярова.

Увайшоўшы ў свінарнікі мы здзівіліся. Пад новай страхой вялікага свінарніка, у светлых і добра абсталяваных стойлах стаялі добра дагледжаныя, сытыя свінні. Каля іх упраўляліся свінаркі.

— Цэлая фабрыка мяса!—канстатуе старшыня,—вось вам іёркшыр, 18 пудоў важыць. Выкармлен і выгадаван рукамі нашай лепшай ударніцы Усцінні. Усе спагадліва азірнуліся на Усціння. Пачуўшы размову пра сябе, яна саромліва павярнула твар у бок старшыні.

— Годзе табе, Ігнат, хваліць, не звыкла я.

— А чаму?—не згаджаўся старшыня.—Раз заслужыла ты гэтага, значыцца варта і пахваліць. Ты ў нас, Усціння, гонар калгасу. Тваёй работай і клапатлівасцю мы смела можам ганарыцца. Няхай вучацца другія, як трэба працаваць, каб мець такія свінарнікі, як у нас.

Задаволеныя аглядам свінарнікаў мы накіраваліся ў клуб, каб правесці гутарку з калгаснікамі і падзякаваць Усцінню за яе старанную работу на ферме.

С. Богуш.

Полацкі раён.

Перанесці вопыт Сенненшчыны ў д

Палітаддзел Заслаўскай МТС накіраваў у Сенно экскурсію калгасніц, даў заданне вывучыць вопыт барацьбы сенненскіх калгаснікаў і калгасніц за добраякасную і своечасовую апрацоўку ільну. Вось што расказваюць калгасніцы аб усім бачаным:

Палітаддзел Сенненскай МТС адвёз нас у адзін з буйнейшых і лепшых калгасаў—калгас „Расна". Кіруе гэтым калгасам Кабачкоўскі Дзяніс—член ЦК, добры гаспадар і добры палітычны кіраўнік.

Лёну гэты калгас меў 187 га, а ўсяго зямлі мае паўтары тысячы га. Акрамя таго мае дзве буйнейшыя, моцныя СТФ і МТФ. Калгасу „Расна" яго перамогі даліся выключна дзякуючы аддонай рабоце калгаснікаў і аператыўнаму кіраўніцтву палітаддзела МТС. У часе самых напружаных работ—уборкі і сяўбы—калгаснікі працавалі круглыя суткі. Ворава пад жыта праводзілася ўначы. Жніво ўсяго ячменя праводзілася толькі начамі, а ўдзень убіралася жыта і авёс.

Такім чынам калгас адным з першых скончыў уборку, здачу збожжа дзяржаве, натураплату МТС і сяўбу жыта.

Паміж сабой калгасніцы спаборнічаюць і вынікі спаборніцтва падводзяцца штодзённа. Лён кожнай калгасніцы пасля работы зважваецца, пераглядаецца якасць тропкі і тут-жа на таку кожны вечар лепшыя калгасніцы прэміруюцца грашыма па 3—5—10 руб.

Акрамя таго калгас вылучыў 50 проц. хлеба на стымуліраванне хода ільноапрацоўкі і кожную пяцідзёнку выдае калгасніцам па колькасці вытрапанага валакна. Запіс працадзён ідзе выключна на аснове прагрэсіўнай здельшчыны, за недавыкананне норм за кажнае кіло запісваецца менш, за кожнае перавыкананне болей налічваецца сотак.

Калгаснікаў Сенненшчыны ўжо не задавальняе старая тэхніка апрацоўкі лёну, яны шукаюць новыя метады, якія палягчаюць працу, паляпшаюць якасць і павышаюць тэмпы апрацоўкі лёну.

Палітаддзел тут сам дапамагае ім. У аднаго рабочага МТС тав. Хадыка Сяргея з явілася ідэя пабудаваць машыну—ільнотрапалку. Палітаддзел зараз-жа падхапіў гэтую ініцыятыву, выклікаў інжынера, пры дапамозе якога ідэя тав. Хадыкі набыла першы выгляд тэхнічнага чарцяжа з дасканалымі падлікамі, а пасля выгляд драўлянай ільнотрапалкі, простай, але даючай вялікі колькасны і якасны эфект.

У дзень МЮД'а гэтую ільнотрапалку палітаддзел падараваў калгасу „Расна". На гэтай трапалцы можа адначасова праца-

ТЫЧНЫХ МЕТАДАЎ ПРАЦЫ!

Трактарыстка Ніна

Раніцою з калгасных палёў даносіліся ў вёску раскацістыя водгукі трактарных матораў. Вёска прачыналася.

Па вуліцах гуртам ішлі на работу калгаснікі і калгасніцы. Сярод іх узнімаўся бадзёры гоман і звонкі пералівісты смех дзяўчат.

Ідучы дарогаю, папарадзе старых, дзяўчаты жвава размаўлялі паміж сабой. Адны з іх прыслухоўваючыся запэўнялі:

— Чуеце? А Ніна з Вераю ўжо грукочуць на сваіх конях!.. Другія здзіўлена згаджаліся:

— Ім дык і не спіцца. Казалі, што пасля ўчорашніх скокаў яны спаць будуць, а яны бачыш што вытвараюць...

Калгаснікі гуртам набліжаліся да калгаснай базы. Адтуль усе звенямі ішлі за вёску на вялікую плошчу развораную бульбы і браліся за работу.

***

Паднімаючы скібы свежай зямлі, Ніна пераклікалася звонкім голасам са сваёю таварышкай Верай. Седзячы на трактары яна што раз націскала педаль і павялічвала хуткасць. Трактар рушыў наперад, цягнучы за сабой трохлямешны плуг. Доўгія істужкі ўзнятай зямлі, нібы застыглыя хвалі заставаліся за трактарам. І гэта радавала Ніну.

— Сёння перавыканаю норму!— гаварыла яна сабе,—вось каб газы яшчэ з'эканоміць, было-б зусім добра. І тут-жа даўшы трактару хуткасць, яна на паўголаса запела галасістую песню, якая рэхам пакацілася за гай.

Недзе далёка працавалі калгасныя брыгады. З вышыні трактара Ніне відно было, як вяла трактар яе таварышка Вера, з якой яна спаборнічае. Ніна паглядала ў яе бок і прыкідвала, колькі выпрацавана абодвума трактарамі. Абмерыўшы вокам сваю плошчу, яна бачыла, што спраўляецца з работай, а сёння, відаць, будзе значнае перавыкананне нормы. Радасная яна яшчэ з большай энергіяй рушыла трактар наперад, у спаборніцтва за першынство.

***

Сонца садзілася на ўскраіну леса. Ударныя брыгады калгаснікаў ішлі на абедзены перапынак. Вазакі выпрагалі з вазоў коняй і адводзілі ў стайню. Кожны спяшаўся дамоў падмацавацца гарачым, смачным абедам. У полі рабілася пуста. Толькі трактарныя маторы неспынна грукацелі ў шырокім прасторы, узнімаючы скібу за скібай тлустую зямлю.

Трактарыстка Ніна.

Неўзабаве да трактароў прышла змена. Вызваліўшыся Ніна з Вераю накіраваліся ў вёску. Дарогаю разгаварыліся:

Ну, як ў цябе?—запыталася Вера.

— Нічога. Сёння перавыканала!

— А, як спаборнічаеш з трактарыстам Шарапам?

— А вось паглядзі,—адказала Ніна,—тут у журнале запісана ўся работа. У мяне выканана ворыва 1,99 га, у Шарапы—1,49 га, у мяне—200 выпрацаваных працадзён, у яго—180.

— Малайчына!— падбадзёрвала Ніну таварышка,—трымайся! Цябе не дарма паслаў палітаддзел на курсы трактарыстаў. Ты сябе апраўдала.

Радасныя яны ішлі дарогаю і размаўлялі аб сваім жыцці і ўдарнай рабоце на трактарах. Бадзёрасцю і ўпэўненасцю свяціліся іх вочы. Яны хутка падыходзілі да калгаса, дзе даўно чакаў іх смачны ўдарны абед.

Бухцілаў.

ругія раёны

аць 18 жанчын. Прадукцыйнасць тропкі на гэтай машыне павялічваецца прыкладна ў два разы. Якасць валакна атрымоўваецца на 2 і больш нумароў вышэй ручной. Калгаснік гэтага-ж калгаса зрабіў новы тып ручной трапалкі. Яна мае форму звычайнай шырокай трапалкі, па сярэдзіне мае 4 скразных прадольных прарэза.

Калгасніца Пакатовіч Уліта магла вытрапаць звычайнай трапалкай 6 кгр. лёну, а новай трапалкай яна вытрапала за такі-ж самы час— 8 кгр. лёну.

Калгаснікі Варговін і Матусевіч вынайшлі спосаб перабудовы старых дымных печаў у бяздымныя, і гэта таксама дало надзвычайна вялікі эфект. Нумарнасць валакна пры бяздымнай сушцы павялічваецца на 2, а то і 4 нумары. Дровы для топкі такой печкі можна ўжываць абы якія, у той час, калі для сушкі дымнай печкі ўжываюцца толькі сухія альховыя і бярозавыя дровы.

Палітаддзел МТС зараз-жа гэты вопыт распаўсюдзіў па ўсяму раёну. Значная частка калгасаў ужо перабудавала дымныя печы на бяздымныя.

Перад калгасніцамі калгаса „Расна" мы ўзялі на сябе абавязкі: перанесці вопыт Сенненшчыны ў калгасы Заслаўшчыны.

Лепшыя ўдарніцы Курашэвіч Вольга, Пакатовіч Уліта, Верновіна Марыля, Тапган Наста, Барадаўка Усціна выказалі жаданне пабываць у калгасах Заслаўшчыны для абмена вопытам другіх сельскагаспадарчых работ.

Наша задача баявой работай, рашуча разбіваючы ўсе перашкоды, перанесці вопыт Сенненскіх калгаснікаў у нашы калгасы і дабіцца яшчэ лепшых поспехаў.

Л. Путырская.

Заслаўскі раён.

Тры таварышкі

Віктар Казлоўскі

Праразлівы, прыдушаны крык і лямант вырываўся з Максімавай хаты. Домна выпусціла даёнку з рук і выскачыла на вуліцу. Яна бяжыць як апантаная, раструшаная, з падбітым вокам. Людзі спыняюцца, неўцямна разводзяць рукамі і спагадліва ахаюць. І хто яе не абзывае, яна не аглядаецца. Бяжыць моўчкі, засопшыся, уздоўж сяла, за сяло, у сельсавет. У сельсавеце ўжо нікога не было. Яна прысела на ганку і заплаканымі вачыма ўглядаецца ў адвячоркавую, глыбокую сіняву. Далёка за вёскай мільгацяць, пераліваюцца ў праменнях заходзячага сонца чырвоныя, белыя, блакітныя хусцінкі.

Над палямі, над лугамі плыве, звініць і далёка, далёка коціцца дзявочая песня:

Па шырокай, па даліне
Войска краснае ідзе.
А дзяўчына, як маліна
З камандзірам полк вядзе.

Домна ўслухоўваецца ў кожнае слова гэтай песні, у пералівістае павышэнне і паніжэнне голасу. Яна адчувае невыказнае шчасце гэтых радасных і бадзёрых дзяўчат-калгасніц, якія працінаюць душу ёй сваёй песняй. Яе сэрца б'ецца ў такт гэтай песні. Ёй хочацца спяваць разам з імі, але голас засох на вусцах яе.

Вясёлым гаманлівым гуртам прайшлі дзяўчаты паўз сельсавет. Папярадзе ішла яе колішняя таварышка Аніся. Яна штосці расказвала, жартавала і звонкі залівісты яе смех вострым, невыказным болем крануў Домнінае сэрца. Ёй здалося, што Аніся—адна з найлепшых яе таварышак і тая адхіснулася ад яе, радуецца яе гору. Але не... Яны не ведаюць яе гора. Яны не заўважылі яе тут, у змроку, адзінокай, на сельсавецкім ганку. Яны дапамаглі-б ёй, параілі-б, што рабіць.

А дзяўчаты аддаляюцца і знікаюць у змроку і гоман паволі змаўкае.

Домна засталася сядзець на ганку. Цяпер яна адчула сябе яшчэ больш адзінокай і пакінутай. Ёй стала яшчэ горш крыўдна і горна. Апусціўшы галаву на калені, яна беражком фартуха выцірала слёзы. А ў думках прамільгнула ўсё яе гаротнае жыццё. Калісці яна, са сваёй таварышкай Анісяй—дванаццацігадовымі дзяўчынкамі былі батрачкамі ў кулакоў. І разам, забраўшыся ў пуню начаваць, расказвалі адна адной сваё гора. А вось цяпер Аніся не тая. Вясёлая, жыццярадасная. І тут Домна ўбачыла тое велізарнае бяздонне, якое ляжыць паміж яе жыццём і жыццём Анісі—калгасніцы і яе новых таварышак з калгаса.

— Так нельга... Больш так нельга!—вырвалася з яе вуснаў—Аніся! Аніся! Я з табой!.. Ці чуеш? Аніся!.. І гулкі, працяглы голас яе прарэзаў адвячоркавую цішыню. Яна ўсхапляецца і з прасцёртымі рукамі бяжыць наўздагон дзяўчат. Але яны не чуюць, ужо даўно схаваліся ў сяло і разышліся па хатах. А яна бяжыць і ледзь чутным голасам паўтарае сама сабе: „Так нельга... Так нельга... Муж мой... Муж мой акаянны"... І знямогшыся падае на мосціку, прысланіўшыся к парэнчы. Закрывае твар далонямі і плача. Прахожыя спыняюцца і пытаюць: „што здарылася"?

А яна маўчыць і плача. Раптам яна адчула, як нечая рука лагодна кранулася яе галавы. Яна прыўзняла вочы і ўбачыла перад сабою сваю таварышку Анісю.

— Домна, любая! Што з табой? Скажы, што такое?.. Домна?! Ці чуеш? Хіба-ж ты тоішся перад сваёй таварышкай? І ты не скажаш ні слова?..—дапытвалася ў яе Аніся.

— Дарагая Аніся... Я прашу цябе... Не пытайся... Мне цяжка... Мне крыўдна... Я не магу зараз...—узнервавана, праз плач, перапыняючыся, гаворыць Домна.

— Пакінь любая! Супакойся!—упрашае яе Аніся.—Пойдзем са мной. Яна ўзяла Домну пад рукі і ўзняла на ногі. Яны пайшлі разам.

Вуліцай імчаліся ім насустрач адна за адной падводы. Віхрам, стралой ірваліся няўтрымныя коні. Погляд Анісі спыніўся на трэцяй падводзе. Яна заўважыла Васіля. Ён высокі, стройны стаяў на возе, трымаючыся за лейцы. Яго ўскудлачаныя валасы абсыпаліся на вушы, на скроні, на лоб.

— Куды, Васіль, апаўночы?—спыталася яна.

— Снапы вазіць. Гайда з намі!—Ужо здалёк, аглянуўшыся гукнуў, ён і яго голас заглушыўся гулкім, конскім тупатам і лёскатам драбін.

Таварышкі падыйшлі і селі на лавачцы пад Анісінай хатай. Яны глядзелі ў даль, услед прагрымеўшым падводам.

Пасля доўгага маўчання, Домна загаварыла першай.

— А, весела ў калгасе працаваць. Дружная братва. Я ўжо даўно-б уступіла, але вось муж... Муж мой п'яніца горкая. Не пускае. З гэтым „святым апосталам" Боханам евангелістам звязаўся.. Не, досыць... Больш так не будзе. Ці толькі свету, што ў вакне. Зарабіць сумею сама—і на сябе і на дзіця. Каб раней, загінула-б я з ім. Бацька не прыняў-бы. Ды дзе-б там было дзецца. Хоць у свет ідзі. А цяпер... Не тое. Пайду ў калгас. І сама сабе буду пані. Кіну яго акаяннага. І ўсе калгасам за мяне заступяцца...

Яна гаварыла павольна, перапыняючыся. А калі змоўкла, Аніся ласкава прыхіліла яе да сябе і сказала:

— Любая, Домна, якая ты дзіўная. Чаго-ж ты маўчыш і накутуеш, а на калгас і не зважаеш. Гэта-ж твой ратунак. Памятаеш дні мінулыя, як мы з табой парабчанкамі былі? А вось цяпер, бачыш сама, і гора не знаю. Мы ў дзвёх і бацька зарабілі летась больш за сто пудоў хлеба. А бульбы, а збажыны ўсялякае колькі! Бачыш, дом які паставілі, а таксама не адважваліся ісці ў калгас. Раней малака ў вочы не бачылі, а цяпер карова свая, свінка апарасілася... Ды ці ў гэтым-жа, Домна, наша шчасце. Глянь ты на нашы палі калгасныя, які прастор! А калі выйдуць усе гуртам у поле,—а-ж люба глядзець! Брыгады за брыгадамі. Вераніцамі плугі снуюць па полі. І трактары і машыны нам на дапамогу,

І палі, і коні, і машыны—усё наша. А ў цябе што?—кляча лядашчая, ды муж п'яніца.

— І хлеб ужо даўно пазычаем.—перабівае яе Домна.

— От, бачыш. А ў нас застаецца, яшчэ другім пазычаем.

Пакуль яны гаварылі, падводы ўжо другі раз імчаліся на поле.

— Васіль, пачакай! І мы з табою, аклікнула Аніся. Яна схапіла Домну за руку і пабеглі да воза. І калі Аніся ўскочыла на

воз, Домна нерашуча спынілася. У гэты момант конь ірванууся наперад і Домна засталася стаяць. Яна разважала: „што рабіць? А муж? Выжане з хаты... Што рабіць?“ Але пачуўшы Анісін воклік—„Дом-на!“—яна забыўшыся пра ўсё, не помнячы самой сябе, на хаду ўскочыла на Міхасёў воз.

— Я з вамі, таварыш Кедаў—загаварыла яна да Міхася. Міхась, не верачы сваім вачам, нахінуўся і ўтаропіўся ёй у твар, усклікнуўшы:

— Дык ты, Домна, з намі? Вазіць? —Так, з вамі. Вазіць!.

— Назаўсёды, з намі разам?

— Так, з вамі разам!

Аніся і Домна адна перад адной стараліся, як найспрытней і хутчэй падаць на воз снапы. Шпарка, куляючыся ляцелі адзін за адным угару снапы. Хлопцы ледзь спраўляліся ўкладаць.

Аніся нервавалася і ўсё аглядалася.

— Колькі ў цябе, Домна?—пыталася яна.

— Дзесятая.

Аніся-ж падавала яшчэ толькі сёмую „бабку“. Калі ўжо адправілі па два вазы, яны падлічылі колькі каторая падала. І вышла пораўну,—па 25 „бабак“ кожная.

Каля другой гадзіны папоўначы скончылі вазіць.

— Ды ты маладзець, Домна,—звярнулася да яе Аніся.—Будзе з цябе добры працаўнік. Заўтра, спадзяюся, пойдзем разам на поле. Усё аформяць, заяву толькі давай. Залічаць.

І яны ўзяўшыся пад рукі пайшлі ўслед за падводамі ў вёску. А ноч была сіней вачэй Анісіных, цішэй слязінаў Домніных. Ідуць яны дарогай пыльнаю, выгінастаю. І месяц сыпле ім святло бялявае ў вочы. А па далінах сцелецца туман густы. І песня ціха, ціха паплыла ў туман далінамі:

— Ой, расцвіла ружа, расцвіла,—зацягнула Домна. І падхапіла Аніся:

—Мела я мужа басяка!

І, нарэшце, два мілагучныя галасы зліліся ў адну працяжную мелодыю:

— Нічога не робіць, толькі п'е.

Прыдзе да дому—жонку б'е...

— Не, любая, не! Досыць!

Больш ён біць не будзе!—перарваўшы песню загаварыла Домна.—Досыць! Больш так нельга!...

Аніся запрасіла таварышку сваю да сябе. А даўно яна была ў Анісі—яшчэ ў старой, трухлявай, падпёртай хацінцы. Цесна, і гразі па калені было ў хаціне тэй. А гэта—чыста і хораша прыбрана. На стале абрус узорчаты засланы. Сцены паперай у кветачкі каляровыя выклеяны. А па абапал гадзінніка Сталін з Калінінам пераглядаюцца.

Аніся паказвала і хвалілася партрэтам сваім у газеце, ды мандатам на раённы з'езд ударніц-калгасніц, які быў яшчэ ўвесну, у Бабруйску. Домна глядзела і цешылася з радасці сяброўкі свае.

Вячэралі яны—смятану з блінцамі пшанічнымі, а яшчэ малаком салодкім запівалі.

Засталася Домна начаваць у Анісі. Думамі галава закружылася, пакуль сон узяў Домну. Замітусіліся ў вачах яе прывіды розныя, страшэнныя. І вось бачыць яна праз сон дужыя, касцістыя, аброслыя валасамі мужавы рукі, якія схапілі яе за шыю і ціснуць, бязлітасна ціснуць. Яна не можа ні зварухнуцца, ні крыкнуць. Душна ёй і цёмна робіцца ў вачах яе. А яго п'яныя вочы наліваюцца кроўю і ярасцю звярынай. Ён патрабуе аддаць апошнія грошы. А маленькая дачка Гэля крычыць, плача, захлынаецца слязамі. Цяжка ўздыхаючы і засопшыся, узнервавана кідаецца яна ў пасцелі.

— Домна! Домна! Што з табой? Любая..—Пачула яна праз сон Анісін голас. Лыпнула вачыма і ўбачыла ясную раніцу і сонца ад люстры гуляе па падлозе. Аніся стаяла ля яе ложка і трымалася за яе руку.

* * *

Домна не адважылася ісці да дому, але дзіця малое непакоіла яе. Трэба дагледзець. Яна ішла і разважала: „што рабіць? Развод? У калгас? Ці мірыцца з жыццём такім?“

Як толькі прачыніла дзверы, дык і навaліліся на яе, як на тую шапку ліхую і муж і свякроў—„такая ты, ды сякая, кошка збродлівая, дзе валачылася ўсю ноч? З калгаснымі плюндрамі бадзяешся?—Я з цябе выганю ахвоту ў калгас ісці“,—з пенай на губах нападаў на яе муж. Толькі залвіца Анюта заступілася за яе. Каб не яна, дык-бы зноў кухталёў зарабіла ад мужа.

— Сваёй работы хапае, а яна калгаснае пыніць!—Неўтаймоўваўся муж.

І „апостал святы“—так празвалі Бохана старога—евангеліста, угаворваў яе:

— Дзіця маё. Агляніся на сябе, што ты робіш. Свет дагары варочаецца. Гіне. Глянь, калгаснікі твае да чаго даходзяць. У вялікае свята араць ідуць. Таму вось з голаду пухнуць. Паглядзі ты на Хвядору, на скарыначках адных жыве.

У Домны кроў закіпела злосцю і гневам.

— Ах, апостал ты стары! Падкулачнік! Ды ці-ж Хвядора на калгасным? Яна-ж на сваім жыве. Што раней мела, тое і цяпер. Яна-ж яшчэ толькі сёлета ўступіла. Пабачыш, што будзе мець пад канец года. Не менш ста пудоў хлеба і напэўне 700 пудоў бульбы. Яна з сынам (а ён-жа яшчэ слабы работнік, дзіця) зарабіла трыста працадзён. І то глядзі, калгас яе падтрымлівае. Авансу ўзяла. Карову гадуе. А мяне не ўгаворыце. Пайду, дальбожа-ж пайду. Кіну п'яніцу такую. Досыць... І што гэта з цябе за муж,—звярнулася яна да Максіма,—другія мужчыны, дык за валасы цягнуць сваіх жонак у калгас, а ты горш бабы... Чаго-ж нам, скажы, гібець так. Бачыш, унь, як людзі зажылі ў калгасе. Узяць хоць-бы Амісю Аляксееву, ці Міхася Кедава. Аладкі пшанічныя ядуць. Вось і мне на зацірку дзіцяці дала пытляванай мукі. А ты што?...

—Я сам сабе волен. Ніякі чорт не будзе распараджацца мной. Як захачу, так і зраблю, што захачу—то і з'ем.

—Трасцу з хваробай ты з'ясі, калі так жыць будзеш... Домна кінула ў качаргэшнік чаплю і пачала капацца ў сваіх клунках. Шукала паперы і алоўка. Дастала з куфэрка звязаную кіпу пісем свайго былога каханка Паўла, які зараз працуе ў Менску на заводзе „Комунар“. Яна адарвала кавалачак пісьма, на якім другі бок быў чыстым. З гэтай паперай яна пабегла да Анісі. Анісі ўжо дома не было. Пайшла на поле. Тады яна—да Настасі.

—Пішы, дарагая!

—Што,пішы?

—Пішы заяву ў калгас. Я буду дыхтаваць, а ты пішы. Настася спрабавала ёй пярэчыць, але Домна настойвала на сваім „пішы, ды й толькі, пагаворым пасля“., Настася выкапала агрызак алоўка, завастрыла яго і прымастраваў-

шыся на рагу стала—запыталася: „што пісаць?“

—Пішы: паскольк і беднячка спрадвечная... І жыць больш так не магу... А муж мой падпявала кулацкі і апостальскі сабутыльнік, прашу мяне ў калгаснікі прыняць... Адну, без мужа... От і ўсё.

Настася пісала павольна, выводзячы зграбненька кожную літарку. І не паспявала за ёй запісваць. Домна яшчэ некалькі разоў паўтарыла і, нарэшце, дабавіла: „і дзіця маё таксама запішыце ў члены калгасныя, а фамілію маю чытаць прашу не Кісель, а Бароўская, бо гэта ёсць мая спрадвечная фамілія. А муж мне цяпер—не муж, а вораг мой... На гэтым пастаў кропку...

—Дык ты ўсё-ж наважыла ісці ў калгас? Ды адна аднэй?—запытала Настася.

—Ды як-жа, любачка. Даўно трэ‘ было, ды дурасць наша бабская. Але от, што ты, Настася, думаеш сабе? Няўжо-ж ты так і карпецьмеш на гэтым шнурочку?

—Я і сама не ведаю. Каб і думала, дык бацькі пярэчаць. Пачакаю, пабачу...

Домна схапіла заяву і паімчалася ў праўленне. Старшыня сустрэў яе з урачыстай усмешкай. Прывітаў і шчыра паціснуў руку.

— А муж твой як?

— Развод. Прашу заяву аб гэтым напісаць мне.

— А гэта ўсё ў сельсовеце зробяць табе.

— А я табе ўпісаў працадзень за возку снапоў у спісачку асобным,—сказаў рахункавод.

Домна вясёлая і здаволеная пакінула праўленне.

— Малайчына, Домна! —крыкнуў ёй услед старшыня. — Ідзі працуй, а цябе на днях сходам агульным залічым!

* * *

Але Домна на работу не вышла! Прайшоў дзень, другі, а яна не ідзе. Нават на сход не прышла, на якім думалі заяву яе разглядаць.

Усе дзівіліся, што гэта з ёй сталася. Прайшоў тыдзень і другі, а яна і з дому не вылазіць. Толькі пасля вышла бульбу сваю выбіраць.

— Хіба-ж раздумала? пыталася ў яе Аніся.

— Дзіця маё нешта захварэла. Ды і сама я не ведаю, што рабіць. Муж мой не хоча, а самой з дзіцем—цяжка будзе.

І хадзіла Домна, як пад зямлёю, з думак галава ходырам хадзіла. Стане гэта яна ля вакна, з дзіцем на руках, і глядзіць у сад, доўга глядзіць. А лісце сыплецца і кружыцца на ветры. І сумна і цяжка на душы Домнінай.

* * *

На пакровы Домна прыбралася, села з дзіцем на ганку і „катка“ спявае.

А калгаснікі гуртам па вуліцы ідуць. Дзень ураджайны святкуюць. І нясуць яны на руках сваіх—хто капусты качан з цабэрак, хто бручку, хто бурак. Дзядзка Міхась, дык жыта сноп высокага, як сасонік той. Цётка Хвядора бульбіну, як галаву ў руках падкідае. А сяброўка яе Аніся жменю ільну вышэй росту свайго ў руцэ нясе, а ў другой руцэ яе сцяг чырвоны. І развяваецца гэты сцяг і зіхаціць над галовамі калгаснымі. Папарадзе музыканты ідуць: дзве скрыпкі, гармонік і барабан. Барабаншчык Пеця ў такт хадзе б‘е. І песня гучыць і кліча, кліча яе, Домну ў рады калгасныя. І сэрца яе калоціцца. Слёзы на вачах выступаюць, радасцю пераліваюцца. І захопленая яна бяжыць з дзіцем сваім, становіцца ў рады побач з Анісяй. Уключае свой крок у стройны рытм хады. Голас яе далучаецца да магутнага калектыўнага голасу і песня бадзёрасці гучна разлягаецца па сяле.

Назаўтра Домна дзіця прыпаручыла свякрові, а сама пайшла з Анісінай брыгадай пшаніцу малаціць. Першы раз у жыцці яна стаіць ля такой малатарні. Праўда, калісці і ў кулака малаціла ў малатарні, але тая коньмі, а гэта вялізная такая і трактар у яе запрэжаны. Адразу і малоціць, і арфуе. Чыстае зерне тут-жа сыплецца ў падвешаныя мяшкі.

Домна з Анісяй падавалі снапы. Домна падносіла, а Аніся развязвала і кідала на „столік“ падавальшчыку. Яны спраўляліся за трох. Спрытна ляцеў сноп за снопам, з рук у рукі.

І адчула Домна сапраўдную радасць калектыўнай працы, адчула яна, што ніякая сіла не верне яе да мінулага. Яна з захапленнем пазірала на стройныя, разлічаныя рухі кожнага работніка. Смуглы, кучаравы трактарыст, вышчэрваючы белыя зубы, усміхаўся ёй. Яна штосці расказвала сваёй таварышцы, жартавала і час ад часу напявала: „ой расцвіла ружа, расцвіла“...

А калі ішла дадому, старшыня сказаў, каб працавала, працадні залічаць, а прымаць будуць разам з другімі, урачыста ў дні Окцябрскія.

І чакала Домна Окцябрскіх свят.

Праўленне атрымала паперку з раёна аб парадку правядзення Окцябра. Калгаснікі рыхтаваліся. Да свят закончылі будаваць новую абору і свіран. Паставілі лазню. Яшчэ напярэдадні прыбралі вуліцу, двары і хаты. Клуб упрыгожылі лапкамі яловымі, лозунгамі, плакатамі і партрэтамі. Аніся пашыла сабе новае шоўкавае плацце. А Васіль чаравікі і порткі на выпуск справіў сабе.

Банкет наважылі зрабіць у складчыну. Хто яек, хто масла, хто мукі пшанічнае, а дзядзка Міхась мёду пчалінага жбаночак. Цётка Хвядора дык гусь усмажаную ў каробцы прынесла. Домне і Анісі прыпаручылі бублікі розныя ды кулічы пячы.

Яшчэ на захадзе сонца музыканты рэзалі марш, а малыя мітусіліся ля дзвярэй клубных і заглядалі праз вокны і замочную шчыліну, як прыгожа ў рады сталы растаўлены, з ядзэннем усялякім і прысмакамі. Праз гадзіну клуб быў бітком набіты. Старшыня сядзеў за сталом на сцэне і пазіраў на гадзіннік. Адчыненне ўрачыстасці павінна было пачынацца а восьмай, а па яго гадзінніку яшчэ рана было. І ён чакаў. А народ непакоіўся, гудзеў:

— Пачынаць, давай будзем!

Вось ён узняўся.—скінуў шапку, абапёрся рукамі на стол і пачаў:

— Таварышы... Урачысты вечар, прысвечаны гадавіне Окцябрскай рэволюцыі, лічу адчыненым!.. Аркестр заграў „Інтэрнацыянал“. Увесь зал, як адзін чалавек, устаў, мужчыны скінулі шапкі.

У прэзідыум запрасілі лепшых ударнікаў і ўдарніц. Між імі сядзелі: дзядзька Міхась, як ганаровы член прэзідыума—партызан і ўдарнік, цётка Хвядора—ударніца даярка, Аніся—лепшая ўдарніца першай брыгады.

За Домніным сталом сядзелі Адарка, Маня, брыгадзіры, — Пятрусь і Васіль Габрусёвы. Домна ўслухоўвалася ў прамову старшыні. Яна чула:

— Зараз наш калгас акрэп. Наш моцны калектыў паказаў на практыцы, як трэба працаваць і жыць. Нашы калгаснікі зараз лепш жывуць за аднаасобнікаў. У гэтым годзе мы атрымліваем па пяць кілограм збожжа і 12 кілогр.

Шырэй разгорнем конкурс на лепшую даярку

Пытанне барацьбы за развіццё і падняцце жывёлагадоўлі павінна стаяць у цэнтры ўвагі ўсіх калгаснікаў і калгасніц. Хутка павялічыць пагалоўе стада і палепшыць яго якасць—наша неадкладная задача.

Наша партыя і ўрад вынеслі пастанову: павялічыць пагалоўе жывёлы з 36,8 млн. галоў да 65,5 млн. галоў да канца 1934 года. Гэта пастанова павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсіх калгаснікаў і калгасніц.

Злева загадчыца фермы тав. Гуцова к-с „Чырвоны Маяк", пасярэдзіне Ксеня Кавалёва—старшыня к-са „Чырвоны працаўнік" і Берына Жэня заг. фермай к-са „Чырвоны працаўнік".

Абвешчаны ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурс спаборніцтва на лепшую ферму ставіць перад даяркамі наступную задачу:

1. Поўную ліквідацыю ялавасці кароў.
2. Нармальны ацёл усіх кароў.
3. Павысіць удой кожнай каровы.
4. Палепшыць догляд і ўтрыманне жывёлы.

Для прэміравання лепшых даярак па ўсебеларускаму конкурсу вылучана 80.000 руб. і па ўсесаюзнаму конкурсу—70 тысяч рублёў. Прэміі вылучаюць таксама і паасобныя раёны. (Сіроцінскі раён вылучыў 8.000 рублёў).

Кожная калгасніца-даярка, уключаючыся ў конкурс, бяручы на сябе абавязацельства—раней за ўсё павінна паставіць перад сабой задачу аб замацаванні сябе на ферме.

Акрамя гэтага даярка павінна ўзяць на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Дабіцца поўнага ацёлу ўсіх замацаваных за ёю кароў і захаваць усіх цялят добрадагледжанымі з тым, каб перадаць іх целятніцы.
2. Дабіцца таго, каб ніводная карова не засталася ялаўкай.
3. Дабіцца канкрэтнага павелічэння ўдою.
4. Дакладна выконваць усе зоатэхнічныя і ветэрынарныя правілы ў справе даення і ўтрымання жывёлы.
5. Добра выдойваць кароў і пры дойцы выконваць поўнасцю гігіенічныя правілы.
6. Быць актыўным удзельнікам на ўсіх вытворчых нарадах.

Пры поўным выкананні ўсіх гэтых умоў, кожная даярка бясспрэчна будзе сапраўдным гаспадаром малочна-таварнай фермы.

Па БССР у конкурс ужо ўключылася 500 лепшых даярак. У калгасе „Ленінец", Шумілінскага сельсовета, Сіроцінскага раёна, калгасніца даярка Касцючэнка Надзя ўключылася ў конкурс, а таксама мабілізавала астатніх даярак. У выніку праведзенай работы і пры актыўнай дапамозе загадчыцы фермы т. Струковай ферма мае значныя дасягненні.

Уключэнне ў конкурс даярак з кожным днём усё больш і больш павялічваецца. Па аднаму Менскаму раёну ўключылася ў конкурс 11 малочна-таварных ферм, з ахопам 87 даярак. Адна з перадавых ферм калгаса імя Фалько поўнасцю падрыхтавала да зімы памяшканні, укамплектавала статак і забяспечыла яго кармамі. Гэтая ферма выклікала на спаборніцтва даярак калгаса „Другая пяцігодка", Грычанскага сельсовета, у выніку чаго лепшыя даяркі Маліноўская Надзя і Дзергай Марфа, першыя ўнеслі прапанову карміць кароў па складзеным рацыёнам, а не „на вока". Яны-ж арганізавалі вучобу па зоатэхмінімуму.

Лепшыя даяркі Касцючэнка Надзя, Маліноўская Надзя і Дзергай Марфа безумоўна з'яўляюцца кандыдатамі на прэміраванне.

Кожная даярка павінна паследваць прыкладу перадавікоў. Не павінна быць ніводнай даяркі, якая не ўключылася-б ва ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурс спаборніцтва на лепшую даярку і ў паход імя імя VII з'езда Советаў. Сандлер.

ТРЫ ТАВАРЫШКІ

бульбы на працадзень. І нашую дужасць, нашую заможнасць бачаць аднаасобнікі. Яны ідуць да нас. Усім вам вядома гісторыя з Домнай Бароўскай...

Пры гэтых словах Домне стала неяк несамавіта, яна зачырванелася і апусціла голаў. Маня яшчэ бліжэй прыхінулася да яе і сказала:

— Ганарыся, любачка, чаго-ж сароміцца.

Пасля калгаснікі дзяліліся ўспамінамі пра сваё ранейшае, цяжкае жыццё. І расказвалі, як яны выбіліся ў людзі, калі ўступілі ў калгас. Андрэй—чырвонагвардзеец расказаў як бралі Кранштадт, а Міхась,—як белапалякаў з-за Беразіны выганялі, як партызаны налёты на іх рабілі.

Пачалося прэміраванне ўдарнікаў.

— Першую прэмію з дзяўчат атрымлівае наша лепшая ўдарніца Свірская Аніся—адрэз сукна на пальто,—абвяшчае старшыня.

Аніся вышла, узяўшы на рукі падарунак сказала:

— Дзякуй таварышы. Надалей буду лепш працаваць, як цяпер.

Музыка зайграла туш. Гул воплескаў пракаціўся па залу. Домна ўстала і, несупынна пляскаючы ў ладкі, праважала вачыма за стол сваю таварышку.

А калі старшыня абвясціў прыём у калгас, Домна замітусілася. Яна старалася не слухаць. Саромілася гэтай сваёй неўмела складзенай заявы. Але яна пачула, як прачыталі заяву Мані Грабавай. За ёй пачалі галасаваць за Адарку Драздовіч. Домна чакала і хвалявалася. Яна ўважліва глядзела на старшыню і, абапёршыся локцём на стол, грызла ражок сваёй хусткі. Раптам прарэзалася і прагучэла ў вушах яе: „заява Домны Бароўскай". Яна ўтупіла вочы ў зямлю і старалася ні на кога не глядзець. Старшыня чытаў: „паколькі я беднячка спрадвечная, а муж мой..."

— Брава, Домна, брава!—прагрымела ў залі.

— Хто за?

Лес рук узляцеў над галовамі.

— Домну!

— У прэзідыум Домну!

А ў Домны сэрца трапечыцца, як з грудзей не вырвецца, шчокі заружавеліся. Яна ўсхваляваная, радая, між радамі сталоў накіравалася на сцэну.

Старшыня моцна паціснуў ёй руку, а з Анісяй яна пацалавалася.

І радасцю невыказнай іскрыліся вочы яе. (*Працяг будзе*).

Менск 10/X—34.

Сустрэча

З. Бандарына

Частка 2*)

У маёнтку пані Карніцкай

Пакінуўшы свайго элегантнага мужа ў Бадэне на водах, засмучанай звярнулася пані Альзона з прыёмным сынам—васьмігадовым Уладзікам, у свой маёнтак на Пятроўшчыне, дзе безвыезда жыла яе маці.

Гледзячы на знаёмыя куткі маёнтка, Альзона прыпамінала свае маладыя інстытуцкія гады ў Смольным.

Штогод прыязджала яна на вакацыі ў маёнтак—старое гняздо паноў Карніцкіх. Дужа любіла Альзона гэты час у сваім жыцці. Жывым вобразам перад ёю паўставаў зараз фурман Янук, які з вялікай пашанай прывітаўшыся пачне ёй у дарозе апавядаць навіны. Як нарэшце пасля доўгай дарогі пад'язджаюць яны ў Пятроўшчыну, і ёй насустрач з клёкатам вылятаюць старыя бацяны, схіляюцца старыя таполі, клёны і ліпы... Адусюль сурова пазіралі на яе даўнія продкі. Вось насупраць у шырокім корналіне, з напудраным парыком і дзіцячым тварам яе прабабка па бацьку,—яе некалі знайшлі павешанай на ліпе каля сцяны. З ёю побач у чорнай гарсэтцы, у тонкай вышыванай сарочцы.ды малінавай канфедэратцы на галаве—цётка Марына.

Моўчкі ўспамінае пані Альзона, і нейкая ўласная незадаволенасць выводзіць яе з залі, вядзе ў дзіцячы пакой. Тут сярод блакітнай меблі, зробленай пад Уладзікаў рост, на падлозе яна бачыць яго сухлявую фігурку, нахмураны лоб і побач раскладзеныя часткі канструктара, з якіх ён майструе машыну.

Заўважыўшы пані Альзону, ён не кідаецца ёй на шыю, як раней, а крыху дзікліва, нізка хіліць галаву з-пад брывей, недаверліва пазірае на яе.

— Ваўчанё,— шэпча пра сябе пані Альзона і, не маючы сілы стрымаць накіпаючую злосць, гаворыць:

— Колькі разоў я табе казала, што ты не павінен сядзець на падлозе, што для цябе спецыяльна рабілі гэтыя крэслы. Але заўважыўшы за Уладзікавай спіной кухаркіну Ядвісю — чарнявую дзяўчынку з разумнымі не па гадах вачыма, грозна накінулася на яе:

— Ты, што тут робіш?..

— Гуляю—смела пазіраючы ў вочы злоснай пані—адказала Ядвіся. Такая непасрэднасць канчаткова вывела з сябе панну Альзону і тупаючы нагамі, амаль у гістэрыцы, яна гнала Ядвісю вон на кухню—абяцаючы разлічыцца з яе маткай. Спалоханая дзяўчынка адыходзіла да дзвярэй, а пані размахвала над яе галавой пачкай звязаных рахункаў. Момант... і нямоцная бічоўка лопнула, снежынкамі пасыпаліся белыя лісткі рахункаў на абодвух дзяцей, падлогу, меблю. Разам з бічоўкай лопнула цярплівасць, прарваўся наверх той настрой, што мучыў з ранку, калі падлічвала неаплачаныя рахункі мужа з рэстаранаў, бараў, модных майстэрняў. Тут-жа перад ёй паўставаў Уладзікаў гувэрнёр, які ранкам патрабаваў надбаўкі.

Усё гэта парушала спакой і хвалявала панну Альзону.

— Я на цябе грошы трачу, а ты... губляючы свядомасць шагнула яна да Уладзіка і схапіўшы яго машыну, замахнулася, каб кінуць яе ўслед Ядвісе.

— Не руш!—па суровому зазвінеў дзіцячы голас. Абураны хлопчык не мог утрымацца і тут-жа моцна ўкусіў пані за руку.

— А-А...—пані Альзона не верыла ўласным вачам. Уладзік... няўжо ён мог адважыцца?.. не, ёй гэта здалося... Ці-ж не яна турбавалася аб яго добрабыце, ці-ж не яна ні ў чым не адмаўляла яму, старанна захоўваючы яго паходжанне. Ён рос здольным, ласкавым... і ці не рабіла яна ўсё, каб быць яму сапраўднай маці? І вось... на руцэ ля запясця пячэ сіняя адзнака вострых зубоў, а насупраць з невыказанай нянавісцю, пазыраючы на яе, захлёбваючыся слязамі крычыць Уладзік:

— Я ведаю, усё ведаю!.. Яна мне ўсё расказала! Ты не мая маці, ты—чужая, ты забрала, ты ўкрала мяне...

Далей пані Альзона нічога не чула. Згубіўшы прытомнасць, гадзіны дзве ляжала яна, як нежывая. На Уладзікавы крыкі прыбегла аканомка і хотка заварушыўся ўвесь дом. Хтосці бег да доктара. Хтосці распранаў і клаў на сэрца Альзоны кампрэс, хтосці нёс кілішак валер'янкі.

*) Пачатак глядзі ў № 17.

Рост культуры ў Совецкім Кітаі

У той час, калі капіталістычны Кітай зачыняе дзверы культуры для пролетарыята Кітая і сродкі, асігнаваныя на асвету выдаткоўваюцца на ваенныя патрэбы, культура ў Совецкім Кітаі прагрэсіруе. У кожным совецкім раёне Кітая працуюць ленінскія элементарныя школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, школы па ліквідацыі непісьменнасці і т. д. Дзеці Совецкага Кітая наведваюць школы, дзе яны выхоўваюцца ў большэвіцкім напрамку.

Калі ў белым Кітаі наведваюць школы каля 17% насельніцтва, то ў Совецкім каля 70%. Дзеці школьнага ўзроста арганізаваны ў „Чырвоныя дзіцячыя групы", якія наведваюць розныя гурткі пасля школы, гуляюць і выконваюць грамадска-карысную працу.

Асабліва наглядаецца небачаны энтузіязм і цяга працоўнай жанчыны Кітая да вучобы. З 15.740 курсантаў, якія ліквідуюць сваю непісьменнасць у гэтым годзе ў губерні І'юнкуо—10,752 складаюць жанчыны. Жаданне вучыцца ў Кітайскай сялянкі і работніцы такое вялікае, што яны робяць вялікія поспехі і раней тэрміна заканчваюць куро вучобы. Многія з іх працуюць на фронце асветы—загадчыцамі школ, кіраўніцамі груп непісьменнасці і т. д.

Для ліквідацыі непісьменнасці ўжываюцца ўсе сродкі. Існуюць вячэрнія школы для непісьменных, розныя курсы, вучоба на даму. Нават на вуліцах стаяць спецыяльныя дошкі для кансультацыі. Ці можа аб гэтым марыць працоўны не Совецкага Кітая, які дагэтуль застаецца цёмным, некультурным, прыгнечаным.

У кожным раёне ўсёй работай па ліквідацыі непісьменнасці кіруе камітэт. Напрыклад, у губ. І'юнкуо, існуе 130 аб'яднанняў па ліквідацыі непісьменнасці, якія маюць 561 філію на вёсках. Філіі кіруюць 3387 курсамі з колькасцю 22.529 чалавек. Хуткі рост газетнай справы таксама гаворыць аб узрастаючай культуры Совецкага Кітая.

Напрыклад, у цэнтральным раёне Совецкага Кітая налічваецца 34 газеты, з якіх „Чырвоны Кітай" павялічыў свой тыраж з 300 да 40.000 экз., „Праўда моладзі" выходзіць у 28.000 экз., і „Барацьба"—27.000 экз.—гэта гаворыць аб росце культурнага ўзроўня Совецкага Кітая. Расце рэволюцыйнае мастацтва і чырвоны спорт.

Зараз у цэнтральным раёне Совецкага Кітая пад кіраўніцтвам Народнага Камісарыята Асветы працуе Чырвонаармейскі універсітэт, совецкі і комуністычны, шмат педагагічных школ. Вялікі ўдзел у падняцці асветнага ўзроўня працоўных Совецкага Кітая, займае працоўная жанчына.

(З эсперанцкай газеты „На пасту")

ЗА РУБЕЖОМ

Пісьмо работніц Швецыі

Дарагія работніцы і калгасніцы Беларусі!

Мы, работніцы Сэвадален, знаходзячыся ў абкружэнні капіталістычнай Швецыі, шлем вам наша калектыўнае пролетарскае баявое прывітанне.

Нас радуюць вашы поспехі. Кожны ваш крок наперад—гэта крок наперад і для нас. Вашы дасягненні натхняюць нас, паказваюць нам сапраўдны шлях да пераможнай барацьбы.

Пры капіталістычным ладзе жанчына прыгнечана ўдвайне. Многія з нас—сапраўдныя нявольніцы. Беспрацоўе, беднасць—вось спадарожнікі нашых работніц. Наша работніца эканамічна залежыць ад мужчыны, занята заўсёды хатнімі справамі і, нават, не можа наведваць сходы. Жонка рабочага ў нас з самай раніцы да позняй ночы ведае толькі хатнія справы.

Ваш совецкі лад вызваліў жанчыну і зрабіў яе поўнапраўным членам грамады, чаго няма ў капіталістычных краінах. Ёсць яшчэ адзін род прыгнечання—гэта хатнія працаўніцы, якія за свой неабмежаваны працоўны дзень атрымліваюць дробязь. Яны не маюць нават выходнага дня. Бывае, што „гаспадары" робяцца далікатнымі да сваіх прыслуг. Гэта бывае раз у год перад выбарамі. Дабіваючыся таго, каб прыслуга галасавала за партыі, якія абараняюць паноў, гаспадары абяцаюць ёй вольны час для галасавання. Але на вялікі жаль „гаспадарам" часта ўдаецца абмануць прыслуг.

У нашай краіне, дзе здрадніцкі соцыял-дэмакратычны ўрад, растуць падаткі, растуць цэны на прадукты, павялічваецца беспрацоўе, расце беднасць. Хатняя гаспадыня і работніца адчуваюць прыгнечанне капіталістычнага ладу. Жанчына ў прамысловасці вельмі эксплаатуецца; тэкстыльшчыцы цяпер павінны працаваць удвая больш чым раней, за тую-ж зарплату. Рабочыя і работніцы хварэюць прафесіянальнымі хваробамі, але дармовага лячэння не атрымліваюць.

Радасна канстантаваць, што не толькі рабочыя, але і работніцы пачынаюць цікавіцца палітычным жыццём і прымаць актыўны ўдзел у барацьбе за лепшы лад.

Работніцы ўжо разумеюць, што, каб перамагчы на фабрыцы, трэба самой змагацца пад кіраўніцтвам рэволюцыйнай арганізацыі.

Шведскія металісты з года ў год усё больш і больш далучаюцца да чырвонай профінтэрнацыянале, пакідаючы рэфармісцкія профсаюзы.

Работніцы бачаць, што соцыял-дэмакратычны ўрад не дзейнічае ў інтарэсах рабочага класа, што соцыял-дэмакратычныя правадыры актыўна змагаюцца супроць совецкага ладу. Іх газеты змяшчаюць артыкулы аб вашай беднасці і розную іншую хлусню. У царквах пастары збіраюць грошы для пасылкі нібы „беднякам" у Совецкі Саюз. Праз гэта яны праводзяць вялікую антысовецкую прапаганду. І гэта ўсё робіцца ў нашай беспрацоўнай краіне, дзе беднасць усё больш расце і расце.

Усе сродкі прапаганды супроць адзінай рабочай дзяржавы—Совецкага Саюза—скарыстоўваюцца капіталізмам здапамогай соцыял-дэмакратычных правадыроў для таго, каб палепшыць сваё ўласнае існаванне. Але ўсё шырэй і шырэй распаўсюджваецца сярод рабочых праўда аб Совецкім Саюзе, якая зрывае маску хлусні аб Советах.

З вялікай надзеяй, што нам удасца ўцягнуць у рэволюцыйную барацьбу ўсё больш і больш работніц, мы работніцы Швецыі палка вітаем Вас свабодных работніц і калгасніц, і абяцаем вам—разам з усім рабочым класам змагацца супроць капіталізма, вайны і фашызма, за мір і абарону Совецкага Саюза, за Совецкую Швецыю.

Няхай жывуць работніцы і калгасніцы Совецкага Саюза!

Няхай жыве Окцябрская рэволюцыя!

Няхай жыве сусветная комуністычная партыя на чале з тав. Сталіным!

Ад імя сходу работніц—11 подпісаў.

Палкае пролетарскае прывітанне работніцам і працоўным сялянкам капіталістычных краін!

За інтэрнацыянальную салідарнасць працоўных усяго света!

За сусветны Окцябр!

Становішча жанчын на капіталістычным Усходзе

1. Жанчыны не з'яўляюцца роўнапраўнымі членамі грамадства

У капіталістычных краінах Усхода жанчына—не чалавек, а беспраўная істота. Яна беспраўная істота не таму, што прыродай створана быць гэткай, а таму, што існуючыя эксплаататарскія парадкі, стварылі для яе беспраўныя, нечалавечыя ўмовы жыцця.

У чым-жа заключаецца гэтая беспраўнасць і нечалавечы прыгнёт для сотняў мільёнаў жанчын Усхода? Ён заключаецца ў наступным: у такіх краінах, як Індыя, Персія, Аравія—жанчына зусім не карыстаецца ніякімі правамі ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Мала таго, яна не карыстаецца рашаючым голасам у сваім сямейным калектыве, дзе гаспадаром сям'і з'яўляецца толькі мужчына. Мужчына распараджаецца жонкаю, як яму заўгодна, бо жанчына на Усходзе—гэта прадмет уласнасці і эксплаатацыі.

Становішча жанчын, як святой і недатыкальнай прыватнай уласнасці для сваіх мужэй, зацверджана, рэлігійным законам ісламa. Ад імя бога і прарока —гаворыць іслам: „жанчына — гэта несумленная істота, таму яна не павінна паказваць свайго твару чужым мужчынам", „яна павінна быць сціплай нявольніцай свайго гаспада—мужа", „жанчына, як несумленная істота, не мае права датыкацца да святой навукі".

Гэтая-ж рэлігія дае поўнае права многажонству. Любы прававерны мусульманін карыстаецца правам не толькі мець некалькі жонак, але мае права заключыць (сіга) часовы шлюб на любы тэрмін. Гэтая сістэма шлюбу распаўсюджана ў Персіі яшчэ і зараз.

Такім чынам, жанчына на Усходзе не толькі не з'яўляецца роўнапраўным членам чалавечага грамадства і сваёй сям'і, але больш таго, на яе нават не распаўсюджваецца элементарнае чалавечае права.

2. Падваенне эксплаатацыі жанчын Усхода

Жанчыны на Усходзе—самая танная рабочая сіла. Атрымліваецца гэта таму, што выключная беднасць насельніцтва і існуючыя сямейныя цяжкія ўмовы прымушаюць жанчыну ісці на любую работу і любыя ўмовы. Праца жанчыны ўжываецца ва ўсіх галінах вытворчасці і сельскай гаспадаркі. Асабліва ў каўраткацкіх прадпрыемствах і тэкстыльнай прамысловасці. Цяжарныя жанчыны і малалетнія дзяўчыўнкі, на працягу 12-гадзіннага рабочага дня нерухома сядзяць на каўраткацкіх станках у сырых і цёмных памяшканнях. Яны не толькі раней часу старэюць, але пазбаўляюцца зроку і робяцца калекамі.



Персідскія каўраткальнікі—мужчына і жанчына, якія ў выніку жорсткай эксплаатацыі зрабіліся калекамі.

Кастрычнік вызваліў частку жанчын Усхода. Дзякуючы Кастрычніцкай рэволюцыі, у сучасны момант на Совецкім Усходзе: Азербейджан, Узбекістан і ў іншых рэспубліках, жанчыны не толькі „несумленныя і не маюць права датыкацца да святой навукі", як казала рэакцыйнае духоўніцтва, а наадварот—жанчына Совецкага Усхода значна прасунулася ўперад.

3. Прыклад Кастрычніка абуджае ўвесь Усход

Узмацненне капіталістычнай эксплаатацыі з аднаго боку, і Кастрычніцкія заваёвы на Совецкім Усходзе з другога, штодзённа ўзмацняюць жаночы рух у краінах капіталістычнага Усхода.

Першай з такіх краін з'яўляецца Турцыя, дзе жанчына, безумоўна, пад уплывам Кастрычніцкай рэволюцыі, пачынае прымаць удзел у грамадскім жыцці краіны. Гэта тлумачыцца тым, што ў 1920 годзе жанчыны Турцыі арганізавана змагаліся супроць англійскіх імперыялістаў за нацыянальнае вызваленне Турцыі. У 1924 годзе турэцкі ўрад, бачучы ролю жанчыны ў грамадскім жыцці, выдае закон, які забараняе многажонства.

Не гледзячы на тое, што гэтыя рэформы да некаторай ступені маюць свае дадатныя бакі, усё-ж такі жанчына ў Турцыі яшчэ не атрымала поўнага вызвалення, таму, што ўсе гэтыя рэформы носяць буржуазны характар і імі карыстаюцца жонкі інтэлігенцыі і буржуазіі. Становішча-ж працоўных жанчыны амаль ні ў чым не змянілася. Калі ў Турцыі, дзякуючы буржуазнай рэформе, жанчыны ў сучасны момант больш менш карыстаюцца сваімі правамі, дык у астатніх краінах Усхода—Аравіі, Індыі, Персіі, Афганістане зусім адсутнічаюць адзнакі хаця-б падобных буржуазных рэформ.

Але ідэі Кастрычніцкай рэволюцыі настолькі глыбокія, што яны ўсё больш ахапляюць мільёны працоўных жанчын Усхода.

Актыўныя выступленні жанчын у палітычнай барацьбе асабліва выразна паказалі сябе ў Індыі. За апошнія гады разам з паўстаючымі рабочымі і сялянамі расце роля жанчын у гэтым рэволюцыйным руху. Пасля ўсеіндыйскай жаночай канфэренцыі, якая адбылася ў горадзе Алахабадзе ў 1921 годзе, жанчыны актыўна паказалі сябе ў барацьбе супроць класавых ворагаў. Выступаючы супроць англійскіх імперыялістў, яны падпальвалі і разбуралі чыгуначныя масты, каб затрымаць перавозку армій супроць паўстаўшых рабочых і сялян. Жанчыны выступалі актыўна супроць памешчыкаў і духавенства, падпальваючы храмы і захаплялі землі гэтых „святых земляўласнікаў".

Няма сумнення, што ў недалёкай будучыні сотні мільёнаў працоўных жанчын Усхода вызваляцца ад сапрадвечнага нявольніцкага становішча. Пад кіраўніцтвам Комуністычнага Інтэрнацыянала яны зоймуць сваё гістарычнае месца ў нашай агульнапролетарскай палітычнай барацьбе.

Мраіль Шахбазі (Бабаян).

ГПБ Ср. Аз.

Калгасніцы—рацыяналізатары

Усё больш і больш праяўляецца актыўнасць калгасніц і работніц у справе будаўніцтва самых буйнейшых у свеце соцыялістычных гаспадарак, у справе соцыялістычнай рацыяналізацыі іх.

За апошнія часы цэлы рад калгасніц дасылаюць нам свае рацыяналізатарскія прапановы, свае мадэлі новых вынаходак. Тав. Лісоўская Мар'я Міхайлаўна з калгаса „Чырвоны барацьбіт", Мсціслаўскага раёна прыслала ў Наркамзем сваю мадэль ільномялкі. Ільномялка тав. Лісоўскай значна лепшая для практыкі калгасаў, чымся існаваўшыя да гэтага часу. Яна складаецца з двух мяльных рычагоў, замест аднаго і разлічана на працу аднаго чалавека, што значна павялічвае вытворчасць яе.

За сваю вынаходку тав. Лісоўская прэміравана.

Другая жанчына—вынаходніца тав. Эльперына прапанавала Наркамзему сканструяванае ёю люстэрка для асвятлення ўлагалішч свінаматак і авец, якое неабходна пры аглядах.

У сучасны момант тав. Эльперына працуе над выпрацоўкай спрошчанага спосаба пастэрызацыі малака для дзяцей калгаснікаў і сельскагаспадарчых рабочых. Да вынаходніцкай працы тав. Эльперына прыцягвае і сваіх таварышак па рабоце.

Н. Васілеўскі.

ВЯДРО-МАЛАКОМЕР

Студэнт Горацкага сельскагаспадарчага Інстытута вынайшоў спецыяльнае вядро для рацыяналізацыі даення, якое ён назваў вядром-малакомерам.

Сутнасць яго вынаходкі заключаецца ў наступным: да звычайнага металічнага вядра з устаўленай у сценку шкляной шкалою, ён прымацаваў 4—5 рухомых шрыфцікаў, пры дапамозе якіх даярка адзначае на шкале колькасць удоя ад кожнай каровы. У такое вядро зліваецца малако адразу ад некалькіх кароў. Гэта пазбаўляе даярку ад неабходнасці насіць малако ад кожнай каровы для вызначэння колькасці ўдоя і зліва.

Каб забяспечыць малако ад забруднення, да вядра-малакомера прыладжана металічная цадзілка, паверх якой зроблена металічная крышка. Даенне малака робіцца ў спецыяльную варонку, зробленую на крышцы.

Такім чынам даярка пры найменшай затраце сваіх сіл атрымлівае адразу ад некалькіх кароў чысты, працэджаны і вымераны ўдой. Вядро-малакомер выпрабавана Горацкай занальнай станцыяй малочнай жывёлагадоўлі і адобрана для ўжывання ў практыцы калгасаў і соўгасаў. Аўтар вынаходкі Наркамземам прэміраван.

У сучасны момант кіраўніцтва Жывёлагадоўлі Наркамзема падрыхтоўвае масавы выпуск такіх вёдраў.

Кожная даярка павінна быць забяспечана такім рацыяналізаваным вядром-малакомерам.

Н. Васілеўскі.

Работніцы, жонкі рабочых, калгасніцы, працоўныя аднаасобніцы!

ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ СВОЙ ЖУРНАЛ

„Работніца і калгасніца Беларусі"

ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЖУРНАЛ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 12 месяцаў	. . . . .	2 руб.	40 кап.
„ 6 „	. . . . .	1 „	20 „
„ 3 „	. . . . .	— „	60 „
„ 1 „	. . . . .	— „	20 „

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і ў лістаносцаў

Кошт асобнага нумара 10 кап.

1964 г.

Старонка кройкі і шыцця



Тлумачэнне да выкрайкі дзіцячай сукенкі на 12 і 5 год

На малюнку першым паказана сукенка-камбінэ, якую патрэбна шыць з двух колераў, напрыклад— з вішнёвага і шэрага.

Какетка паказана клінам наперад, а з-заду паўкругам даверха. Пасак, манжэты і тры контурныя складкі ўперадзе сукенкі шыюцца з шэрага колеру, а ўсё астатняе—вішнёвае.

Сукенку можна таксама шыць і з клетачнага матэрыялу, але какетку, манжэты і тры контурныя складкі ўперадзе трэба кроіць коса, а ўсё астатняе звычайна, тады касыя ўстаўкі будуць вылучацца і сукенка будзе мець прыгожы выгляд.

Калі-ж няма чым камбініраваць, то гэтую-ж сукенку можна шыць з аднаго кляровага гладкага матэрыялу.

Толькі замест какеткі, якая яскрава паказана на вырэзцы тлустай рыскай і адзначана крыжыкам, гэта месца пасля выкрайкі зашываецца ўнутраным нябачным швом.

Спінка кроіцца з аднаго кавалка матэрыялу, а перад сукенкі—з двух кавалкаў, таму што на складкі патрэбна больш матэрыялу.

Матэрыялу на сукенку патрэбна тры метры, (калі будзе аднаго колера), а калі будзе з двух колераў, скажам, шэрага і малінавага, то шэрага патрэбна браць—метр, а малінавага каля двух з паловай метраў.

Выкрайка робіцца таксама, як і ў мінулых нашых журналах (№№ 17 і 18). На другім малюнку паказана сукенка з фланелі на дзяўчынку 5 год. Матэрыялу патрэбна два—два з паловаю метра. Выкрайка робіцца таксама, як і для першага малюнку.

Выданне ЦК КП(б)Б

Ч. в. а. адказнага рэдактара Г. М. АЛЯКСЕЕВА

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая 68, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1280. Тыраж 12.940 экз. Ум. Галоўлітбела № А 5143.

Здана ў набор 23-X—34 г. Падпісана да друку 1/XI—34 г. У нумары 2 1/8 арк. 120.140 друк. знакаў.